Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 220 (5053)
КАСТРЫЧНІКА
2
АЎТОРАК
1934 г.
Год выдання XVI

Ин. 2676
Библиотека Им. Горького

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ВАРТАЎНІК КУЧ ПАПЯРЭДЗІЎ КРУШЭННЕ

ХАБАРАЎСК, 30 ВЕРАСНЯ. (БЕЛТА). З ХАРБІНА ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ АБ НОВЫМ ВЫПАДКУ ПАПЯРЭДЖАННЯ КРУШЭННЯ ПОЕЗДА НА КУЧ ВЫКЛЮЧНА ДЗЯКУЮЧЫ ПІЛЬНАСЦІ І ЎСВЕДАМЛЕННЮ СЛУЖБОВАГА ДОЎГУ З БОКУ РАБОТНІКАЎ КУЧ.

23 ВЕРАСНЯ НА ПЕРАГОНЕ ВЭЙШАХЕ — ЯБЛАНЯ ПУЦЯВЫМ ВАРТАЎНІКОМ БЫЛО ВЫЯЎЛЕНА, ШТО РАСШЫТА 25 ШПАЛ І РАЗАБРАНЫ 2 СТЫКІ РЭЕК. ДЗЯКУЮЧЫ СВОЕЧАСОВАМУ ПАПЯРЭЖАННЮ З БОКУ ВАРТАЎНІКА ДАРОГІ, ВЫЎ СПЫНЕН НАБЛІЖАЮЧЫЯСЯ ПОЕЗД № 222. ГАЛОЎНЫ ШТАБ АХОЎНЫХ ВОЙСК ПАВЕДАМЛЕН АБ ЗДАРЭННІ.

ЗВАРОТ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

АБ ВЫБАРАХ У СОВЕТЫ 1934-1935 г.г.

Больш за 90 мільёнаў выбаршчыкаў будуць прымаць удзел у перавыбарах советаў па Саюзу ССР у 1934-1935 годзе. Выбары ў советы — масавая палітычная кампанія, найшырэйшы агляд перамог социялістычнага будаўніцтва. Выбары—магутная зброя арганізацыі мільённых мас рабочых, калгаснікаў і совецкай інтэлігенцыі на далейшую барацьбу за пабудову социялізма і ўмацаванне советаў — органаў пролетарскай дыктатуры.

Таварыш **Сталін** у сваім дакладзе на XVII партыйным з'ездзе падкрэсліў, што ў нашай краіне социялізм стаў «безраздзельна пануючай і адзіна камандуючай сілай за ўсёй народнай гаспадаркі». Ён гаварыў, што СССР «перафармаваўся ў корані, скінуўшы з сябе аблічча адсталасці і спрадневякоўя. З краіны аграрнай ён стаў краінай індустрыяльнай. З краіны дробнай аднаасобнай сельскай гаспадаркі ён стаў краінай калектыўнай буйнай механізаванай сельскай гаспадаркі. З краіны цёмнай, неграмотнай і некультурнай ён стаў — вярней, становіцца—краінай граматнай і культурнай, пакрытай агрэмаднай сеткай вышэйшых сярэдніх і нізэйшых школ, працуючых на мовах нацыянальнасцей СССР».

Краіна пакрылася сеткай новых фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў і МТС. Вырасілі новыя гарады —буйныя прамысловыя цэнтры Магнітагорск, Сталінск, Караганда, Бярэзнікі, Хібінагорск і т. д. Прамысловыя цэнтры Совецкай краіны на аснове поспехаў социялістычнай індустрыялізацыі растуць небывалымі тэмпамі, ператвараючыся ў социялістычныя ўпарадкаваныя гарады, дзе на першае месца пастаўлены клопаты аб лепшым, культурным жыцці працуючых. На аснове брацкага супрацоўніцтва ўсіх нацыянальнасцей Совецкага Саюза і правільнай нацыянальнай палітыкі партыі і совецкай улады дасягнуты велізарныя гаспадарчыя і культурныя поспехі ў нацыянальных рэспубліках і абласцях.

Калгасны лад, перамогшы ў нашай краіне канчаткова і беспаваротна, забяспечыў велізарны гаспадарчы, палітычны і культурны рост вёскі. Зараз на перавыбары советаў, замест разрозненых аднаасобнікаў, дробных уласнікаў, прыйдуць дзесяткі мільёнаў калгаснікаў — будаўнікоў социялістычнай сельскай гаспадаркі. Калгасы вылучылі ўжо тысячы і дзесяткі тысяч стойкіх барацьбітоў за правядзенне ў жыццё лозунгаў тав. **Сталіна** «зрабіць калгасы сапраўды большэвіцкімі», «зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі».

Лік выбаршчыкаў за апошнія тры гады вырас больш чым на 10 млн. чалавек. Гэта—вырасшая пры совецкай уладзе і выхаваная ленінскай партыяй, комсамолам, профсаюзамі і советамі моладзь нашай краіны, дасягнуўшая за гэты час выбарчага ўзросту, упершыню будзе ўдзельнічаць у перавыбарах. Расшырыліся кадры совецкай інтэлігенцыі ў большасці сваёй з асяроддзя рабочых і сялян. Яны складае цяпер вельмі значную групу выбаршчыкаў нашай краіны.

З велізарнымі перамогамі ў прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, у культурным будаўніцтве і на міжнароднай арэне выступае наша краіна ў наступаючую выбарчую кампанію. Правільная палітыка ленінскай партыі і совецкага ўрада, іх большэвіцкае кіраўніцтва социялістычным будаўніцтвам, нізмерна вырасшая палітычная актыўнасць і вытворчы энтузіязм рабочых і калгаснікаў, згуртаванне іх вакол сваёй роднай партыі і совецкай улады—усё гэта забяспечыла ва ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва рашаючыя поспехі, у асобнасці з часу VI з'езда советаў Саюза ССР.

Перавыбары советаў 1934-35 гг. будуць праходзіць пад лозунгам барацьбы за паспяховае выкананне ў 2-й пяцігодцы праграмы пабудовы бясклясавага социялістычнага грамадства, ліквідацыі капіталістычных элементаў і класаў наогул.

Выбаршчыкі Совецкага Саюза ведаюць, што перамогі социялістычнага ладу дасягнуты ў штодзённай і нярэдка ў вострай барацьбе з варожымі класавымі сіламі. Астаткі капіталістычных класаў, прабуючы аслабіць совецкую ўладу, пранікаюць у органы совецкай улады для скарыстання іх у сваіх мэтах. У вёсцы астаткі кулацтва прабуюць скарыстаць сельсоветы для таго, каб дэзарганізаваць іх работу па ўмацаванню калгаснага ладу. Ворагі совецкай улады праследуюць адну мэту: затрымаць гаспадарчы і культурны рост Совецкага Саюза. Задача советаў—своечасова выкрываць і прасякаць замыслы і падрыўную работу ворагаў працоўных.

Наша вялікая радзіма, магутнасць якой вельмі выраслa за апошнія гады, ператварылася ў магутны аплот міру ва ўсім свеце. Мірная палітыка совецкага ўрада, якая выражае найгалоўнейшыя імкненні ўсіх народаў СССР, страмлінае прызнанне і падтрымку ўсіх друзей міру і за межамі совецкіх граніц. Але яшчэ прадаўжаюць дзейнічаць варожыя нам імперыялістычныя сілы, якія імкнуцца да новых войн, захватаў чужых зямель і заняволення народаў, сілы, якія пагражаюць нашай вялікай радзіме.

Вось чаму перад советамі стаіць задача далейшага ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны, узмацнення магутнасці любімай усімі працоўнымі рабоча-сялянскай Чырвонай арміі—вернага вартавога совецкіх граніц. Перавыбары советаў павінны паказаць жалезную волю рабочага класа і калгаснага сялянства піматлікіх народаў нашай вялікай краіны і гатоўнасць іх не толькі да мірнай працы, але і да гераічнай абароны сваёй радзімы ад нападу ворагаў. Нацыянальнасці, якія насяляюць тэрыторыю Совецкага Саюза, змагаюцца за адзіную мэту, ідуць па адзінаму шляху—да комунізма, і ўсякі, хто стане поперак гэтага шляху, будзе скінут.

Гаспадарчыя і культурныя задачы, якія стаяць перад советамі,— велізарны. Советы павінны ўзначаліць узрастаючы энтузіязм і актыўнасць працоўных у барацьбе за паспяховае сканчэнне другой пяцігодкі. Яны павінны рашуча выкарыстаць бюракратычныя скажэнні, чыноўніцкі падыход і нячуласць у адносінах да патрэб і запатрабаванняў мас. Яны павінны быць застрэльшчыкамі па паляпшэнню складу і ўсёй работы дзяржаўнага апарата, змагаючыся на справе супроць канцэлярска-бюракратычных метадаў у рабоце совецкіх органаў і перабудоўваючы яго на аснове ўказанняў XVII з'езда партыі. Яны павінны арганізаваць лепшы падбор кадраў, канкрэтнае кіраўніцтва, праверку выканання ва ўсёй гаспадарцы і культурным будаўніцтве.

Тэхнічная рэканструкцыя прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспарта з'яўляецца рашаючай гаспадарчай задачай, якая стаіць перад советамі ў другой пяцігодцы. Выкананне гэтай задачы немыслима без рашучага павышэння якасных паказальнікаў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, без далейшага павышэння прадукцыйнасці працы, аўладання тэхнікай, асваення новых вытворчасцей, паляпшэння якасці прадукцыі і зніжэння сабекошту, і ўмацавання працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах, у саўгасах, у калгасах і ва ўсім совецкім апараце, а таксама далейшага паляпшэння матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных.

Перад советамі гарадоў і рабочых пасёлкаў, сёл і вёсак стаяць велізарныя задачы па павышэнню матэрыяльна-культурнага ўзроўню працоўных мас. Далейшае разгортванне комунальнай гаспадаркі гарадоў, упарадкаванне рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў, будаўніцтва школ, больніц і лазняў, дзіцячых садоў, яслей і пляцовак, разгортванне жыллёвага і дарожнага будаўніцтва, клопаты аб грамадскім харчаванні, аб культурным совецкім гандлі,—усё гэта павінна з'яўляцца баявой праграмай работы советаў.

Перад советамі ў вёсцы, ва ўмовах перамогі калгаснага ладу, і велізарнага росту калгасаў, асабліва востра стаіць задача па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў і саўгасаў і па далейшаму разгортванню калектывізацыі. Дабівацца выканання калгасамі абавязацельстваў перад дзяржавай гэта значыць клапаціцца аб умацаванні гаспадарчай калгаса, аб усё большым і большым укараненні машын у сельска-гаспадарчую вытворчасць, аб павышэнні ўраджайнасці калгасных палёў, росце жывёлагадоўлі, культурным захоўванні і перапрацоўцы с.-г. прадукцыі. У гэтым і заключаюцца галоўнейшыя задачы сельсоветаў. Сельсоветы павінны ў штодзённай барацьбе за умацаванне калгаснага ладу ў цэнтры ўвагі сваёй работы паставіць калгаснікаў, дапамогу яму, уцягваць аднаасобнікаў у калгасны рух, паказваючы ім на практыцы перавагі калгаснага жыцця.

Пад кіраўніцтвам партыі і советаў вырасла і ўмацавалася аснова совецкага ладу—социялістычная ўласнасць, аснова якой з'яўляецца галоўнай задачай социялістычнай законнасці. Советы горада і вёскі, праводзячы настойлівую барацьбу за расшырэнне і ўмацаванне, социялістычнай уласнасці, павінны з асобай строгасцю караць расхрадальнікаў народнага здабытку, парушальнікаў совецкіх законаў, усіх тых, хто выступае супроць совецкай дзяржавы і яе інтарэсаў.

Советы—вартавы інтарэсаў працоўных мас—абавязаны строга аберагаць правы рабочых, калгаснікаў і совецкай інтэлігенцыі, не дапускаючы процізаконнага адміністравання і ўкараняючы ў шырокія масы социялістычнае правасазнанне.

Штодзённая барацьба советаў за выкананне ўсіх гэтых задач можа быць паспяховай толькі тады, калі советы яшчэ вышэй падымуць сваю ролю праваднікоў генеральнай лініі партыі, яшчэ больш узмоцняць сваю барацьбу супроць скажэння лініі партыі, супроць класава-чуждых уплываў разлажыўшыхся і абюракратыўшыхся элементаў. Работа советаў па выкананню грандыёзных задач, якія стаяць перад імі, з'яўляецца асноўнай для ацэнкі іх дзейнасці і для складання наказаў новым дэпутатам советаў.

Гарадскія і сельскія советы павінны адчытацца перад мільёнамі сваіх выбаршчыкаў аб праробленай імі рабоце. Кожны дэпутат совета павінен прадставіць сваім выбаршчыкам справаздачу аб тым, як ён выконваў наказы сваіх выбаршчыкаў, справаздачу аб тым, як ён змагаўся за социялізм. Недахопы работы советаў і асобных дэпутатаў павінны падвергнуцца з боку выбаршчыкаў шырокай самакрытыцы, якая выражае сапраўдны дэмакратызм совецкага ладу.

Вылучэнне ў склад советаў лепшых ударнікаў з асяроддзішча рабочых і работніц, калгаснікаў і калгасніц, чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў совецкай інтэлігенцыі і служачых, выбранне ў советы перадавых байцоў за социялізм, арганізатараў і кіраўнікоў социялістычнай вытворчасці і вёскі, актыўных грамадскіх працаўнікоў-энтузіястаў працы і культуры на заводзе і ў калгасе, байцоў за прадукцыйнасць працы і лепшую якасць прадукцыі, далейшае расшырэнне ў складзе дэпутатаў прадстаўніцтва жанчын, моладзі і нацыянальных меншасцей — усё гэта з'яўляецца важнейшай умовай умацавання советаў, як органаў дыктатуры пролетарыята, баявых арганізатараў мірнай працы і абароны краіны.

Советы пад кіраўніцтвам ленінскай партыі вядуць мільённыя масы да далейшых перамог социялізма. На гэтым шляху перад нашай краінай будзе яшчэ нямала труднасцей. Перамаганне гэтых труднасцей забяспечана згуртаваннем мас рабочых і калгаснікаў вакол советаў пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і правадыра т. Сталіна.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік заклікае ўсіх працоўных да актыўнага ўдзелу ў выбарах дэпутатаў советаў, да далейшага ўмацавання пролетарскай дыктатуры, за перамогу социялізма ў нашай краіне.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Аб аднаразовым падатку на аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў 1934 годзе

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

У адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК Саюза ССР ад 26 верасня 1934 г. (гл. «Известия ЦИК Союза и ВЦИК» № 227) Совет Народных камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Устанавіць наступныя канчатковыя стаўкі аднаразовага падатку на аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў 1934 годзе

РАЁНЫ:	КАТЭГОРЫІ ГАСПАДАРАК: Аднаасобныя гаспадаркі, абкладаемыя ў 1934 г. с.-г. падаткам па цвёрдых стаўках.			Аднаасобныя гаспадаркі, абкладаемыя ў 1934 г. с.-г. падаткам на стаўках.	Аднаасобныя гаспадаркі, абкладаемыя ў 1934 г. с.-г. прагрэсіўным падаткам.
	Не маючыя рабочай жывёлы і рыначных даходаў, прыцягваемых да абл. с.-г. падатку.	Не маючыя рабочай жывёлы, але маючыя рыначныя даходы.	Маючыя рабочую жывёлу.	Не маючыя рабочай жывёлы і рыначных даходаў, прыцягваемых да абкладання сельскагаспадарч. падаткам.	Маючыя рабочую жывёлу ці рыначныя даходы.
1	2.	3.	4.	5.	6.
I. Асвейскі, Бягомльскі, Ушацкі, Дрысенскі, Ельскі, Жыткавіцкі, Чырвонапольскі, Лагойскі, Лепельскі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Плешчаніцкі, Прапойскі, Расонскі, Уладзецкі, Тураўскі.	15 р.	30 р.	75 р.	75 проц. акладу с.-г. падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.	120 проц. акладу с.-г. падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для аднаасобных гаспадарак, уплачываючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.
II. Бешанковіцкі, Брагінскі, Бялыніцкі, Брэзінскі, Дзяржынскі, Дубровенскі, Заслаўскі, Камарынскі, Кармянскі, Копыльскі, Крупскі, Любаншэвіцкі, Мазырскі, Пагрыцкі, Петрыкоўскі, Полацкі, Сенненскі, Сіроцінскі, Старобінскі, Суражскі, Талачынскі, Чачэрскі, Чашніцкі, Чырвонаслабодскі, Чэрыкаўскі	17 р.	33 р.	82 р.	82 проц. акладу с.-г. падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.	130 проц. акладу с.-г. падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.
III. Асіпавічскі, Буда-Кашалёўскі, Быхаўскі, Ветка[illegible], Гарадзе[illegible], Глускі, Касцюковіцкі, Клімавіцкі, Клічаўскі, Крычаўскі, Лёзненскі, Мсціслаўскі, Отадарадзкі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Церахаўскі, Чэрвеньскі.	19 р.	36 р.	90 р.	88 проц. акладу с.-г. падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.	145 проц. акладу с.-г. падатку 1934 года, але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.
IV. Аршанскі, Барысаўскі, Віцебскі, Горацкі, Магілеўскі, Менскі, Пухавіцкі, Рэчыцкі, Смалявіцкі, Чаўскі, Шклоўскі, Слуцкі.	21 р.	40 р.	100 р.	95 проц. акладу с.-г. падатку 1934 года, але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.	160 проц. акладу с.-г. падатку 1934 года, але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.
V. Бабруйскі, Гомельскі, Жлобінскі, Рагачоўскі.	25 р.	50 р.	125 р.	100 проц. акладу с.-г. падатку 1934 г., але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с. г. падатак па цвёрдых стаўках.	175 проц. акладу с.-г. падатку 1934 года, але не ніжэй стаўкі аднаразовага падатку, устаноўленай для адпаведных гаспадарак, уплачваючых с.-г. падатак па цвёрдых стаўках.

Кулацкія гаспадаркі ўплачваюць аднаразовы падатак у памеры 200 проц. акладу с.-г. падатку 1934 года.

Гаспадаркі, злоснна невыконваючыя заданых ім планаў слубы і абавязковых паставак с.-г. прадуктаў дзяржаве, абкладаюцца аднаразовым падаткам на агульных падставах, але сума падатку з іх падвойваецца.

2. Устанавіць наступныя тэрміны выплаты аднаразовага падатку: да 1 лістапада 1934 года — 50 проц. акладу і да 10 снежня 1934 г. астатнія 50 проц. акладу.

Кулацкія гаспадаркі ўплачваюць усю суму падатку ў 10-дзённы тэрмін з дня ўручэння плацежнага паведамлення.

3. Налічэнне падатку ўскладаецца на раённыя выканаўчыя камітэты, Менскі, Віцебскі, і Гомельскі гарадскія советы.

Абавязаць усе раённыя выканаўчыя камітэты, Менскі, Віцебскі і Гомельскі гарадскія советы правесці налічэнне падатку такім чынам, каб плацежныя паведамленні былі ўручаны ўсім платнікам не пазней 15 кастрычніка 1934 г., а таксама забяспечыць паступленне налічаных сум на ўстаноўленыя тэрміны, прымяняючы да нядаймішчыкаў прадугледжаныя законам меры грамадзянскага спагнання.

4. Абавязаць усе райвыканкомы, гарадскія і сельскія советы неадкладна разгарнуць шырокую агітмасавую работу па растлумачэнню закону аб аднаразовым падатку.

5. Народнаму Камісарыяту фінансаў БССР неадкладна даць указанні ўсім райвыканкомам, горсоветам і фінорганам аб практычным ажыццяўленні закону аб аднаразовым падатку.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

Кіраўнік спраў СНК БССР
С. ШАБОЛТАС.

1 кастрычніка 1934 г.
г. Менск

ПЛЕНУМ ГОМЕЛЬСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б СУМЕСНА З АКТЫВАМ

Даклад тав. Н. Ф. ГІКАЛО

ГОМЕЛЬ, 1 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэсп. «Звязды»).

30 верасня адбыўся пленум Гомельскага гаркома КП(б)Б сумесна з актывам партарганізацыі. На пленуме прысутнічаў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало**, начальнік Палітсэктара МТС Наркамзёма тав. **Ратнек**, [illegible] Прамысловна-транспартнага аддзела ЦК тов. **Готфрыд** і прадстаўнік рэдакцыі «Правды» тав. **Вігдаровіч**, выбраны разам з бюро ГК у прэзідыум пасяджання.

Грунтоўны даклад аб пастанове ЦК ВКП(б) па гомельскай парторганізацыі зробіў таварыш **Гікало**, якога члены пленума і партактыў сустрэлі бурнымі апладысментамі. У спрэчках па дакладу тав. **Гікало** запісалася звыш 30 чалавек. Выказалася 13.

З вялікай прамовай у спрэчках выступіў тав. **Готфрыд.** Сход ухваліў рашэнне бюро гаркома, у якім намячаюцца мерапрыемствы, заблопечваючыя рэалізацыю дырэктыў ЦК ВКП(б) па становішчу **Гомельскай** парторганізацыі. Сходам пасланы прывітальныя тэлеграмы таварышам **Сталіну, Кагановічу, Гікало** і рэдакцыі **«Правды»**.

Пленум Гомельскага гаркома КП(б)Б выбраў у склад членаў пленума і бюро ГК тав. **Малашонка** — старшыню горсовета, і **Клімчука**, які выбран намеснікам сакратара гаркома.

РОЗЕНБЛЮМ.

АБ ЧАРГОВЫХ ВЫБАРАХ У СОВЕТЫ, НА З'ЕЗДЫ СОВЕТАЎ У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ І VII З'ЕЗД СОВЕТАЎ САЮЗА ССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР **пастанаўляе:**

1. У мэтах правядзення чарговай кампаніі па выбарах у советы і на з'езды советаў у саюзных рэспубліках у адпаведнасці з устаноўленай пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР ад 7 ліпеня 1934 г. (З.З. Саюза ССР, 1934 г., № 37, арт. 293) тэрмінам склікання VII з'езда советаў Саюза ССР, назначаным на 15 студзеня 1935 г., прапанаваць цэнтральным выканаўчым камітэтам саюзных рэспублік закончыць усю чарговую кампанію па выбарах у советы і на з'езды советаў у саюзных рэспубліках к студзеня 1935 года, для чаго правесці выбарчую кампанію ў наступныя тэрміны:

а) выбары ў сельскія советы правесці ў перыяд часу з 1 па 20 лістапада 1934 года;

б) выбары ў гарадскія советы і скліканне раённых з'ездаў советаў правесці ў перыяд часу з 20 лістапада па 10 снежня 1934 года;

в) краявыя і абласныя з'езды советаў і з'езды советаў аўтаномных рэспублік правесці з 15 па 25 снежня 1934 года;

г) з'езды советаў саюзных рэспублік склікаць у перыяд часу з 30 снежня 1934 года па 10 студзеня 1935 года.

УВАГА: У паўночных раёнах Паўночнага краю, у Якуцкай АССР і ў асобных раёнах Далёка-Усходняга і Усходня-Сібірскага краёў выбары праводзяцца паводле пастаноў Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта раней указаных тэрмінаў.

2. Устанавіць наступны парадак выбараў дэлегатаў на VII з'езд советаў Саюза ССР:

а) у Расійскай Социялістычнай Федэратыўнай Совецкай Рэспубліцы дэлегаты выбіраюцца на краявых і абласных з'ездах советаў і на з'ездах советаў аўтаномных рэспублік і абласцей як уваходзячых, так і не ўваходзячых у склад краявых і абласных аб'яднанняў;

б) у Украінскай Социялістычнай Совецкай Рэспубліцы дэлегаты выбіраюцца на абласных з'ездах советаў і на з'ездах советаў аўтаномнай Малдаўскай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі;

в) у Беларускай, Узбекскай і Туркменскай социялістычных совецкіх рэспубліках дэлегаты выбіраюцца на з'ездах советаў гэтых рэспублік;

г) у Закаўказскай Социялістычнай Федэратыўнай Совецкай Рэспубліцы дэлегаты выбіраюцца на з'ездах советаў социялістычных совецкіх рэспублік Грузіі, Арменіі і Азербайджана, на з'ездах советаў аўтаномных совецкіх социялістычных рэспублік Нахічэванскай, Абхазскай і Аджарскай і на з'ездах советаў аўтаномных абласцей Нагорнага Карабаха і Паўднёва-Асецінскай;

д) у Таджыкскай Социялістычнай Совецкай Рэспубліцы дэлегаты выбіраюцца на з'ездзе советаў гэтай рэспублікі і на з'ездзе советаў Горна-Бадахшанскай аўтаномнай вобласці.

УВАГА: рабоча-сялянская Чырвоная армія і флот прымаюць удзел у выбарах на агульных падставах.

Часці Чырвонай арміі і флота, якія па свайму месцазнаходжанню не маюць магчымасці прыняць удзелу ў з'ездах советаў на агульных падставах, пасылаюць па аднаму дэлегату ад кожнай дывізіі на з'езд советаў Саюза ССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль.

27 верасня, 1934 года.

ЗВАРОТ ЦВК САЮЗА—У МАСЫ

МІТЫНГ НА СКУРЗАВОДЗЕ „БОЛЬШЭВІК"

Учора днём на скурзаводзе «Большэвік» адбыўся мітынг, прысвечаны звароту ЦВК СССР аб выбарах у советы.

На мітынгу выступілі рабочыя і работніцы першага і другога хромавага цэхаў тт. **Лагунова, Шарафановіч, Швэйдэль, Дубінская, Канапацкі,** якія адзначылі велізарнае палітычнае значэнне надыходзячай справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў.

Удзельнікі мітынга абавязаліся прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да ўсебеларускага і ўсесаюзнага з'ездаў советаў.

Для аказання дапамогі ў падрыхтоўцы да з'езда советаў рашылі паслаць у падшэфны Самахвалавіцкі сельсовет работую брыгаду.

Калектыў завода выклікаў на социялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзенне справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў рабочых завода імя **Варашылава** і фабрыкі імя **Кагановіча.**

Скурзавод «Большэвік», уключыўшыся ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў, праводзіць значную работу. Паміж цэхамі шырока разгарнулася соцспаборніцтва на датэрміновае выкананне вытворчай праграмы як па колькасных, так і якасных паказальніках.

Рабочы калектыў абавязаўся ўнесці ў фонд VII з'езда советаў не менш **40 рацыяналізатарскіх прапаноў.** Асобныя цэхі (другі хромавы і іншыя) абавязаліся здаць тэхнічны экзамен на «выдатна».

ЛЕПШЫХ ІЛЬНАВОДАЎ—НА СУШКУ, МЯЦЦЕ І ТРОПКУ ІЛЬНУ

„УЗМАЦНІЦЬ ЗДАЧУ ТУРБІННАЙ ТРАСТЫ НА ІЛЬНАЗАВОДЫ“ (З ПАСТАНОВЫ БЮРО ЦК КП(б)Б)

ПІЛЯХТАВА АНАСТАСІЯ — лепшая трапальшчыца калгаса «Апора Савецтаў», Лёзненскага раёна. Па трапаніі дае 18 нумар валакна.

ЛЁН ЧАРНЕЕ НА СЦЕЛІШЧАХ

МАЗЫР. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

У большасці калгасаў раёна яшчэ не прыступілі да пераапрацоўкі ільну. Аб гэтым сведчыць той факт, што на 25 верасня на склады Заготільна паступіла ўсяго 0,1 проц. ільнавалакна.

У большасці калгасаў разасланы лён не падымаюць са сцелішчаў. У калгасе імя Макса Гельца (Бабрыняцкі сельсавет) траста ад перажні аж пачарнела. А праўленне калгаса заяўляе, што падымаць трасту яшчэ рана, трэба каб пралежала яшчэ тыдняў два. Можна сабе ўявіць, што зробіцца з гэтай трастой? І гэты калгас у раёне не адзіны. У большасці калгасаў і вёсак раёна лічаць чамусці, што лён павінен ляжаць як правіла на сцелішчах 6-7, а-то і 8 тыдняў. Такой думкі прытрымліваюцца і ў раёне. Трудна сказаць, ці гэта ўяўляецца вынікам аграманграматнасці ці злачынства. Хутчэй апошняе.

Мазырская «агратэхніка» вылежкі ільну прывяла летась да масавага псавання трасты на сцелішчах. У выніку план выконваўся ільнавалакном вельмі нізкай якасці. Але ўрокі мінулага года нічому не навучылі кіраўніцтва Мазырскага раёна. Гісторыя з перажыванням ільну паўтараецца і гэта зусім не турбуе кіраўнікоў Мазыршчыны.

Праўда, фармальна райком і райвыканком вынеслі даволі суровую пастанову аб паляўнасці ў радзе калгасаў недаацэнкі ільну. Аднак пастанова асталася пастановай, а да пад'ёму ільну са сцелішчаў так і не прыступілі.

Нават у тых калгасах, дзе траста паднята са сцелішчаў, да пераапрацоўкі яе яшчэ не прыступілі.

У Мазырскім раёне ставяць над пагрозу выкананне плана здачы ільнавалакна.

ФРАЛОЎ.

АРГАНІЗАВАЦЬ РАБОТУ МЯЛЬНА-ТРАПАЛЬНЫХ ПУНКТАЎ

Значная частка ўраджаю ільну гэтага года павінна быць апрацавана ручным спосабам. Таму трэба арганізаваць бесперабойную работу сушыльна-мяльных і трапальных пунктаў.

Па БССР да пачатку апрацоўкі ільну неабходна было арганізаваць 400 мяльна-трапальных пунктаў, 1.260 трапальных агрэгатаў, забяспечыць іх сталымі кадрамі, інструктароў, сушыльшчыкаў і мяльшчыкаў.

Якое-ж становішча з сушыльна-мяльнымі пунктамі? Выяўлена, што толькі ў калгасах **«Чырвоны трактарыст»**, Макараўскага сельсавета і **«Чырвоны сцяг»**, Горскага сельсавета, пункты працуюць больш-менш рэгулярна.

Па ўсіх астатніх пунктах не працуюць пасціпарвальныя мялкі, а ў калгасе **«Ленінскі шлях»**, Асталопаўскага сельсавета, гэта мялка да апошняга часу не адрамантавана.

Апрача пасціпарвальных мялак па ўсіх пунктах ёсць у дастатковай колькасці трохвальныя, чыгунныя і драўляныя мялкі, у шасці калгасах—агрэгаты ў 3-4 калясы на станіне «Эддзі».

Але і гэтыя мялкі і агрэгаты ў большасці калгасаў не працуюць.

Рад калгасаў маюць добра абсталяваныя сушыльні, якія забяспечваюць у сярэднім сушку ад паўтоны да 1,25 тоны ў змену. Ва ўсіх калгасах ёсць конныя прывады для прывядзення ў рух мялак і агрэгатаў.

Такім чынам, у гэтых 11 калгасах ёсць поўная магчымасць арганізаваць і разгарнуць работу сушыльна-мяльных пунктаў. Апрача таго, па Горацкаму раёну ёсць 228 чыгунных двух- і трохвальных мялак, 106 драўляных, 18 пасціпарвальных мялак, дзве 12-валальныя і каля 28 бельгійскіх калёс. Аднак, у раёне ніхто не цікавіцца справай арганізацыі пунктаў.

Відавочна, што далей такое становішча недапушчальна. Ніяк нельга прымірыцца і з тым, што Наркамзем БССР гэту справу закінуў, не прыняў абсалютна ніякіх мер да арганізацыі работы сушыльна-мяльных пунктаў.

ЦК у сваёй апошняй пастанове звярнуў асаблівую ўвагу на арганізацыю работы мяльна-трапальных пунктаў. Выкананне гэтай пастановы павінна забяспечыць рашучы зрух у ручной апрацоўцы ільну і здачы ільнапрадукцыі дзяржаве.

КАРАТКЕВІЧ.

АДНААСОБНІКАЎ СКІНУЛІ З РАХУНКУ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Сігнал **«Звязды»** аб ігнараванні ручной пераапрацоўкі ільну ў **Бешанковічах** узварушыў раённыя партыйныя, савецкія арганізацыі і палітаддзел МТС. Неадкладна была склікана нарада старшыень сельсоветаў і калгасаў. Яна прайшла выключна па-дзелавому. Не было агульнай гаварыльні, як звычайна бывае на такіх нарадах.

Падзяліўшы сельсоветы і калгасы на пяць груп, кіраўнікі райкома, РВК, палітаддзела, Заготільна і Камітэта заготовак канкрэтна і дэтальна падзіцілі з старшынямі сельсоветаў і калгасаў рэальныя магчымасці выканання плана ільназагатовак у бліжэйшы час. Пастанова нарады зусім рэальная: **да 15 кастрычніка закончыць здачу лепшай трасты ільназаводам, закончыць ручную пераапрацоўку ільну, поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па загатоўках ільнапрадукцыі.** Астаецца адно: словы ператварыць у справу.

Але калгасы — гэта яшчэ не ўсё. У раёне ёсць каля 50 процантаў аднаасобнікаў. З імі яшчэ не пачата работа па арганізацыі ручной пераапрацоўкі ільну. Ільназагатоўкі ў аднаасобным сектары пушчаны **на самацёк.** Гэта пагражае зрывам своечасовага выканання плана.

А. МІКУЦКІ.

ЛЁН НЕ Ў ПАШАНЕ

СМАЛЯВІЧЫ.

У раёне вялікі разрыў паміж падняццем ільну са сцелішчаў і апрацоўкай яго. Калгас **«Будзёнавец»** (Амельянаўскі сельсавет) падняў лён са сцелішча 17 верасня, а да апрацоўкі яго яшчэ не прыступіў. Таксама да апрацоўкі ільну не прыступіў і калгас **«Большэвік»**, гэтага-ж сельсавета. Тут яшчэ няма сушыльні і мялак, а між тым лён са сцелішча падняты ўжо 21 верасня. Звесні па апрацоўцы ільну ў гэтых калгасах яшчэ не створаны.

Не лепшае становішча з апрацоўкай ільну і ў калгасе **«МОПР»**, «Культура», **«Сталінец»**, Юраўскага сельсавета. Гэтыя калгасы, не гледзячы на тое, што лён паднялі са сцелішча даўно, да апрацоўкі прыступаць не думаюць.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб апрацоўцы ільну да шырокіх мас калгаснікаў не давядзена. Калгаснікі не ведаюць, колькі ім будзе налічана працадзён за апрацоўку ільну.

РК КП(б)Б ільну не аддае абсалютна ніякай увагі. 22 верасня пры інструктаванні райпартактыва, які пасылаўся на вёску, аб загатоўцы ільнавалакна нават ні слова не было сказана.

ПРЫМІЧАЎ, МІНІЧ.

ПОЛКАВА ФРАСІНІЯ — мяльшчыца ільна калгаса «Спаборніцтва», Лёзненскага раёна

НІЖЭЙ ДЗЕСЯТАГА НЯМА

Пашлі па сельсавету чуткі: у калгасе **«Серкуці»** гнояць лён. Паслалі мяне на дапамогу калгасу. Прыязджаю. Іду з старшынёй калгаса т. **Домініч** аглядаць іх лён. Глядзім трасту. Яна рабая: адна сівая, другая рыжая.

Пачынаю распытваць у старшыні, як убіралі, рассцілалі лён, падымалі трасту. Аказваецца, што яшчэ пры цераблені адзін лён ставілі на прасушку ў конусах, другі рассцілалі на поль з галоўкамі. Потым увесь перамяшалі, разам малацілі і рассцілалі.

Той лён, што быў разаслан і ляжаў на полі да малацьбы, хутчэй вылежаўся на сцелішчы, а той, што быў у конусах, не вылежаўся зусім. Падымалі-ж увесь разам. Вышла так: адзін крышыцца, другі цвёрды, як дрот.

А валакно? Адно рыжае, другое белае, трэцяе сіняе. Павезлі на пункт, а там не прынялі. Прышлося разабраць усю трасту. Сівую, якая вылежалася, звязвалі ў кулі, а рыжую зноў адсцілалі. Двайная, а то і трайная работа. Гэта — плата за аграманграматнасць.

У нашым калгасе «Чырвоны араты» агратэхнікай авалодалі ўжо не асобныя адзінкі, скажам, старшыня калгаса, брыгадзіры, намеснік старшыні па ільну, але і радавыя калгаснікі.

Вынікі ў раяўнасці. Два гады назад, калі яны былі аграманграматныя, калі не было большэвіцкай арганізацыі працы ў калгасе,—мы здавалі дзяржаве валакно нумара 4 нават 2. Раён быў на чорнай дошцы. Загатоўкі цягнулі да вясны. Лён купілі.

Сёлета, авалодваючы агратэхнікай, дабіліся рашаючых поспехаў. Валакно дзяржаве здалі ў сярэднім нумарам 13,5. Ніжэй 10-га нумара не было.

У наступным годзе, спадзяюся, даб'ёмся яшчэ больших поспехаў.

Нам. старшыні па ільну калгаса «Чырвоны араты», Сенненскага раёна, АРЫНА МУРАШКА.

У Соўнаркоме СССР і ЦК ВКП(б)

СНК СССР і ЦК ВКП(б) прынялі наступную пастанову аб ходзе хлебаздачы ў Чэлябінскай вобласці:

«Не гледзячы на паляўнасць усіх магчымасцей для хуткага выканання плана здачы хлеба і ўборкі высокага ўраджаю, Чэлябінская вобласць не толькі не дае павышэння тэмпаў хлебаздачы, але, як паказвае апошняя пяцідзёнка, зніжае іх.

На 25 верасня Чэлябінская вобласць не выканала і палавіны гадавога плана хлебаздачы, у той час, як з абмалочанага зярна здана дзяржаве не больш 40 проц. Чацвертая частка хлеба стаіць яшчэ на корані і палавіна скошанага хлеба знаходзіцца ў звалках пад пагрозай гібелі. Зернасоўгасы вобласці выканалі толькі адну трэць гадавога плана хлебаздачы.

Галоўная віна за такое становішча падае на абласны камітэт партыі і яго сакратара **Рындзіна** і на Оргкамітэт советаў і яго старшыню **Саветнікава.**

Соўнарком Саюза ССР і ЦК ВКП(б) **пастанаўляюць:**

1. Папярэдзіць Чэлябінскі абком партыі і Оргкамітэт советаў, што калі яны не дабіўцца рашучага пад'ёму тэмпаў хлебаздачы, якія-б забяспечвалі выкананне плана, да іх будуць прыменены суровыя меры спагнання, а сакратар абкома Рындзін і старшыня Оргкамітэта советаў Саветнікаў будуць зняты з пастоў, як неспраўдзіўшыеся з работай.

2. За зрыў плана здачы хлеба і ўборкі зняць з работы і выключыць з партыі сакратара Упорайскага райкома ВКП(б) **Лызлава**, старшыню Упорайскага райвыканкома **Азанава** і начальніка палітаддзела Бродакаламскай МТС **Теплякова.**

3. За процідзейнасць хлебаздачы зняць з работы, выключыць з партыі і аддаць пад суд дырэктара Бродакаламскай МТС **Власава** і райуправаўнаважанага **Камзаг** СНК па Ішымскаму раёну **Седава.**

4. За поўную бяздзейнасць і патуранне зрыўшчыкам хлебаздачы зняць з работы, аддаць пад суд з нескладным арыштам дырэктара Чэлябінскага зернатрэста **Баландзіна;** за зрыў хлебаздачы і ўборкі і дапушчэнне велізарных страт зярна зняць з работы, аддаць пад суд з нескладным арыштам дырэктара Комсамольскага зернасоўгаса **Бажэнава.**

5. Камандзіраваць у Чэлябінскую вобласць 30 кіруючых работнікаў з Масквы і 20 начальнікаў палітаддзелаў перадавых МТС з іншых краёў і абласцей для дапамогі партыйным арганізацыям на ліквідацыі адставання ў хлебазагатоўках».

БРЫГАДА НАЧПАЛІТАДДЗЕЛАЎ ПЕРАДАВЫХ МТС ВЫЕХАЛА Ў НОВАСІБІРСК

У Новасібірск на дапамогу партарганізацыям, якія адстаюць у выкананні плана хлебазагатовак, выехала з БССР 6 начальнікаў палітаддзелаў перадавых МТС: тав. **Каменштэйн** (Хойніцкай), **Вайнмэн** (Рагачоўскай), **Бангайціс** (Слуцкай), **Кроль** (Дзяржынскай), **Каменштэйн** (Большэвіцкай) і **Плятнёў** (Менскай). (БЕЛТА).

МАНЧЖУРСКІЯ УЛАДЫ ПРАБУЮЦЬ АДМАЎЛЯЦЬ ВЫКРЫТЫЯ ФАКТЫ КАТАВАННЯЎ СОВЕЦКАГА ГРАМАДЗЯНІНА ШАБЛІНСКАГА

ХАБАРАЎСК, 30 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, дыпламатычнае бюро Манчжоу-Го на станцыі Манчжурыя, у адказ на трэбаванне мясцовага консула СССР неадкладна расследаваць весткі аб катаваннях, прымяняемых да арыштаванага начальніка станцыі Манчжурыя, савецкага грамадзяніна Шаблінскага, звярнулася да консула СССР з пісьмом, у якім галаслоўна адмаўляе гэтыя весткі і сцвярджае, быццам «адносіны да Шаблінскага былі самымі добрымі». Дыпламатычнае бюро прабуе далей выразіць «абурэнне» з поваду таго, што «мясцовыя ўлады «неабгрунтавана абвінавачваюцца» ў падобных дзеяннях; тым часам, як вядома, дыпламатычным часам, як вядома, дыпламатычнае бюро пад рознымі фармальнымі прадлогамі адмаўляе консульству СССР у праве спаткання з арыштаваным совецкім грамадзянінам, що можа быць растлумачана толькі як імкненне скрыць сапраўдныя ўмовы трымання пад арыштам Шаблінскага

ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІЯ УЛАДЫ СКАРДЗЯЦЦА НА НЕПРЫГОДНАСЦЬ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ

ХАБАРАЎСК, 30 верасня. (БЕЛТА). Судзячы па паведамленнях з Харбіна, японска-манчжурскія ўлады, намераныя замяняць рускімі белагвардзеўцамі арыштоўваемых і праследуемых совецкіх грамадзян — работнікаў КУЧ, вельмі расчараваны высветленай непрыгоднасцю пераважнай большасці белагвардзейцаў да якой-небудзь карыснай работы. Як прызнае вядомы сваімі антысовецкімі вымыслами Танака на старонках органа японскіх ваенных колаў «Харбинское время», «праведзеныя ўладамі па грамадскіх арганізацыях белай эміграцыі анкеты далі вельмі нездавальняючыя рэзультаты». Жадаючых папасці на работу на КУЧ — паведамляе Танака — вельмі многа, аднак сапраўдны лік эмігрантаў, якія могуць прынесці якую-небудзь карысць на дарозе і прыстасаваных да работы, вельмі невялікі. Нязначны таксама процант такіх, якія ведаюць дзяржаўную (г. зн. кітайскую або японскую) мову.

Такім чынам, Танака вымушан ускосна прызнаць і высокую кваліфікацыю цяперашніх совецкіх работнікаў дарогі, і той факт, што белагвардзейцы, шырока скарыстоўваемыя японска-манчжурскімі ўладамі для гвалтоўнасці і правакацый накіраваных на зрыў работы на КУЧ, непрыгодны для якой-небудзь карыснай работы на дарозе.

ГЕРМАНІЯ І ЯПОНІЯ

ПАРЫЖ, 30 верасня. (БЕЛТА). Збліжэнне Германіі і Японіі прадаўжае прыцягваць увагу французскага друку. Пералічваючы паведамленні аб рыхтуючымся пагадненні, па якому Германія будзе снабжаць Японію хімічнымі прадуктамі і спецыялістамі, а Японія будзе снабжаць Германію неабходным ёй сырцом, — «ЭВР» піша: «Нацыянал-сацыялістская Германія, многа страціўшая ў Італіі, працягвае рукі Японіі. У гэтым ніхто не сумняваецца...

ДЭКРЭТ АБ ВАЕНІЗАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 30 верасня. (БЕЛТА). Учора апублікаван дэкрэт прэзідэнта рэспублікі аб атрадах ваенна-дапаможнай службы. Дэкрэт устанаўляе для насельніцтва абавязковае нясенне ваенна-дапаможнай службы ў выпадку аб'яўлення вайны ці мабілізацыі, а таксама ў мірны час, калі таго патрабуюць інтарэсы дзяржавы. Ваенна-дапаможная павінность пашыраецца на ўсіх мужчын ва ўзросце ад 17 да 60 год, за выключэннем тых, якія знаходзяцца на рэгулярнай ваеннай службе, рэзервістаў і ратнікаў апалчэння.

Да ваенна-дапаможнай службы могуць быць прыцягнуты таксама жанчыны ва ўзросце ад 19 да 45 год. На ваенна-дапаможную службу пашыраецца дзеянне ўсеагульнага ваеннага рэгламента. Дэкрэт упаўнаважвае Совет міністраў увесці ваеннае навучанне для асоб, якія адбываюць ваенна-дапаможную павінность у мірны час. Згодна дэкрэта, асобы, падлягаючыя ваенна-дапаможнай службе, прымаюць удзел у карауальнай службе, службе сувязі, тэхнічнай, процігазна-паветранай, санітарнай

ВЯЛІКІЯ МАНЕЎРЫ ЯПОНСКАЙ АРМІІ

ТОКІО, 30 верасня (БЕЛТА). Канчаткова вырашана, што вялікія 2-хбаковыя манеўры армії, якія будуць адбывацца ў прэфектурах Сайтама, Гумма, Тодыгі, пачнуцца 11-га і закончацца 13-га лістапада. Камандуючымі бакоў на манеўрах назначаны генералы **Аракі** і **Абэ.** Па сканчэнні манеўраў у Такасакі 14-га лістапада адбудзецца грандыёзны ваенны парад часцей, прымаўшых удзел у манеўрах.

Указваючы, што надыходзячыя ваенныя манеўры будуць самымі вялікімі за апошнія гады, «Кокумін» піша, што маштаб манеўраў тлумачыцца тым, што яны адбываюцца напярэдадні міжнароднага крызіса 1935-36 гадоў.

У АБАРОНУ ТЭЛЬМАНА

ПАРЫЖ, 30 верасня (БЕЛТА). Агенцтва «Інпрэс» паведамляе, што саюз французскіх адвакатаў, міжнародная асацыяцыя юрыстаў, камісія юрыстаў па разгляду працэса Тэльмана, міжнародны камітэт барацьбы за вызваленне Тэльмана, многія відныя дзеячы і пісьменнікі, у тым ліку **Ланжэвен, Андрэ Жыд, Рамен Ралан, Андрэ Мальро** пераслалі склікаць 20-га кастрычніка міжнародную юрыдычную канферэнцыю для азнаямлення грамадскай думкі з германскімі судовымі метадамі і становішчам у канцэнтрацыйных лагерах, са справай Тэльмана і з іншымі аналагічнымі працэсамі.

УСТАНАВІЦЬ БЕСПЕРАПЫННАЕ ПРАСОЎВАННЕ ТАВАРАЎ З БАЗЫ ДА ПРАДАЎЦА ХЛЕБА

ТАРМОЗЯЦЬ ХЛЕБАЗАКУПКІ

ЧАУСЫ.

Калгаснік с.-г. арцелі імя Мархлеўскага тав. **Бігоўскі** падлічыў, што ён сёлета за 800 працадзён атрымае 4 тоны збожжа. Значыць хопіць і для сябе і для таго, каб прадаць лішкі хлеба дзяржаве. І калі быў дазволен дзяржаўны гандаль хлеба, Бігоўскі, азнаёміўшыся з умовамі хлебазакупак, даў заказ Антонаўскаму сельпо на абутак, зімняе паліто і патэфон.

Бігоўскі ў раёне не адзін. Перадавыя калгасы і калгаснікі раёна, калгасы **«Сем год без Леніна»**, **«Перабудова»**, **«Юны комунар»** і іншыя прадалі ўжо дзяржаве па 4,5 і нават па 9 тон хлеба.

Хлеб пашоў. Пашоў вялікімі чырвонымі абозамі. Але вось пабачыў сустрэць гэтыя абозы чавучэйка казначэйцы і загатоўшчыкі не здолелі. Няма складаў, няма тавараў, няма кантакту паміж райспажыўсаюзам і Заготзярно. Яны ўсё спрачаюцца на чый рахунак залічыць прывезены хлеб.

Прыёмшчык Заготзярно **Блюмкін** (да рэчы, былы гандляр) адмовіўся прыняць ад калгаснікаў Дужаўскага сельсавета хлеб, куплены сельспажыўтаварыствам. З другога боку, работнікі райспажыўсаюза і яго нізавых арганізацый распаўсюджваюць чуткі, што «калі вы прадасце хлеб Заготзярно, то не атрымаеце тавараў» (маладшае ССТ, старшыня Старазойтаў, антонаўскае ССТ, старшыня Мілокоў і інш.). Упаўнаважаны райспажыўсаюза тав. **Літвін** зачыніў аднаасобнікаў вёскі Хоньковіч, што квітанцыі ад Заготзярно несапраўдныя, і што гэтым аднаасобнікам давядзецца прывезці хлеб яшчэ раз.

Яшчэ ні адзін калгас, калгаснік і аднаасобнік у раёне не атрымаў за праданы хлеб тавараў. У райспажыўсаюзе да гэтага часу ёсць толькі нарады на тавары.

Як правіла, калгасы прадаюць хлеб за лік працадзён, пасля галасавання агульнага сходу, але без уліку магчымасцей і патрабаванняў асобных калгаснікаў. За праданы хлеб калгасы мяркуюць набыць тавары для агульнакалгаснага карыстання. Такім чынам атрымліваецца, што хлеб прадаецца агулам, а калгаснікі не ведаюць, колькі і што можна будзе купіць ім для сваіх патрэб.

Яшчэ больш абуральныя факты маюць месца ў Суслаўскім сельсавеце, дапушчаныя па віне нам. старшыні РВК т. Маскалёва. Вось што гавораць калгаснікі калгаса імя Сталіна аб яго метадах работы.

— Мы яшчэ і зараз не ведаем, колькі нам прыпадзе на працадзень. Але прадстаўнік раёна (гутарка ідзе пра Маскалёва) нам нічога не растлумачыў, сказаўшы толькі, што нашаму калгасу трэба прадаць 5 тон збожжа». Аналагічныя факты мелі месца і ў калгасах Суслаўскага сельсавета.

Усё гэта дае права зрабіць вывад, што раённыя работнікі тылу Маскалёва скажаюць указанні партыі і ўрада.

ВІТ. ДАЛЬ.
П. МІНЧАНКОЎ.

ЧАМУ БАРЫСАЎ ЦЯГНЕЦЦА У ХВАСЦЕ?

(Ад барысаўскага карэспандэнта «Звязды»).

Сёлета Барысаўскі раён атрымаў у сярэднім 10 цэнтнераў збожжа з аднаго гектара, на 2 цэнтнеры больш, чым летась.

З дазволу продажу хлеба дзяржаве пашло больш чым дастаткова часу для таго каб па-большэвіцку разгарнуць гэту работу. Але не відаць, каб у Барысаве па-сапраўднаму ўзяліся за продаж і закупку збожжа.

За 25 верасня па 26 сельсоветах закуплена 41 тона збожжа і заключаны дагаворы на продаж 33 тон. Аднак і гэта нязначная колькасць прадана толькі некалькімі перадавымі калгасамі, якія паказваюць прыклад высокай сумленнасці і арганізаванасці.

Асноўная маса калгасаў яшчэ не раскачалася, ёсць поўнае супрацўленне продажу. Калгас «Чыгуначнік» мае магчымасць прадаць дзяржаве мінімум 5 тон зярна, але дагэтуль не прадана ні аднаго кілё. Перашкаджае гэтаму сам старшыня калгаса, комуніст Жылкевіч, які праводзе калгаснікам кулацкую думку аб тым, што збожжа больш выгадна прадаць на рынку, чым дзяржаве.

Тармозіць работу па закупках ведамственая цягаціна паміж **райспажыўсаюзам і Заготзярно,** якія праводзяць закупку зярна. Асабліва тут стараецца Заготзярно (загадчык Мялешка). Зярно, закупленае райсаюзам і адвезенае на склад Заготзярно, Мялешка залічвае на свой рахунак, нібыта яно закуплена работнікамі Заготзярна. Так, 1,5 тоны зярна, прывезенага з жыткавіцкага сельпо, у Заготзярно запісалі ў свой актыў; райсаюз таксама запісаў. 1 выходзіць па агульнай зводцы, што закуплена 3 тоны, а на склад паступіла толькі 1,5 тоны.

ЧЫКУН.

КАЛГАС КУПІЎ АУТАМАШЫНУ

Калгас **«Чырвоная Рудня»**, Стара-Руднянскага сельсавета, Жлобінскага раёна, прадаў дзяржаве **50 тон** высокаякаснага хлеба. Узамен праданага хлеба калгас хоча набыць грузавую аўтамашыну і промтавары на суму, роўную кошту 10 тон хлеба.

На распараджэнню старшыні праўлення БКС тав. Баскіна, калгас «Чырвоная Рудня», як перадавы ў барацьбе за выкананне плана хлебазакупак, з першай-жа партыі атрымае аўтамашыну.

Белкаапсаюзу занараджана для стымулявання хлебазакупак 25 грузавых аўтамашын, 200 жняярак-самавязалак і рад іншых с.-г. машын. Аўтамашыны ў першую чаргу будуць праданы тым калгасам, якія раней за ўсіх прададуць дзяржаве колькасць хлеба, адпавядаючую кошту машыны.

Па Совецкай Беларусі

ВЫКАНАН ПЛАН ІЛЬНАЗАГАТОВАК

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, ЦВК—тав. ЧАРВЯКОВУ, СНК — тав. ГАЛАДЗЕДУ, РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ»

Неймацянскі сельсавет першым у Сенненскім раёне і рэспубліцы на тры месяцы раней мінулага года выканаў гадавы план ільназагатовак, загатовіўшы ільнапрадукцыю высокай якасці.

У парадку падрыхтоўкі да VII з'езда советаў на 30 верасня перавыканан план мабілізацыі сродкаў. Прадалі дзяржаве больш хлеба, чым мы меркавалі. Набліжаемся да поўнага завяршэння зяблі.

На працадзень калгасніка ў сярэднім прыпадае 4 кгр. зерневых і 12 кгр. бульбы.

Запэўняем партыю і ўрад, што гэтыя поспехі толькі пачатак далейшых перамог калгаснікаў у выкананні лозунга таварыша Сталіна—зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Старшыня сельсавета МАГЕРА

АРГАНІЗАВАНЫ ДВА НОВЫЯ КАЛГАСЫ

ШКЛОЎ. (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

У зоне Шклоўскай МТС 29 верасня арганізаваліся два новыя калгасы: імя **Горкага**, у які ўліліся 63 гаспадаркі, і **«Перамога другой пяцігодкі»**—23 гаспадаркі.

МІКУЦКІ.

БЕЛТОРФ ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛАН СУШКІ І УБОРКІ ТОРФУ

ЦК КП(б)Б — тав. ГІКАЛО, СНК БССР — тав. ГАЛАДЗЕДУ, газеце «ЗВЯЗДА»

Пад непасрэдным кіраўніцтвам і пры штодзённай дапамозе ЦК КП(б)Б і СНК БССР, на падставе масавага правядзення вытворчага паходу імя тав. **Гікало,** заводы Белторфа 29 верасня поўнасцю высушылі і скончылі ўборку здабытых у гэтым годзе 357 тыс. тон торфу.

Мабілізуем сілы на вывазку торфу і падрыхтоўку да сезона 1935 года.

Кіраўнік Белторфа КУЗНЯЦОЎ. Парторг УСЦЮГАЎ.

УВЕСЬ ЗДАБЫТЫ ТОРФ ЗАШТАГЕЛЁВАН

ЦК КП(б)Б — тав. ГІКАЛО, СНК БССР — тав. ГАЛАДЗЕДУ

Рэалізуючы рашэнні Камісіі Парткантроля і бюро ЦК КП(б)Б, Асінторф 25 верасня заштабеляваў увесь здабыты торф. Фарсіруем падрыхтоўку мантажа вялікага гідраторфа.

ТРЫКУТНІК ЗАВОДА.

ПЛАН ТРЭЦЯГА КВАРТАЛА ВЫКАНАН

РЭЧЫЦА, 29 верасня. (Па тэлефону).

Рэчыцкі леспрамгас 29 верасня датэрмінова выканаў заданне па вывазцы будматэрыялаў на 101,2 проц., дроў — 100,9 проц. Гадавы план па загатоўках дзелавой драўніны выканан на 79,2 проц., вывазцы — 91,6 проц., па загатоўках дроў — 93.4 проц., вывазцы — 86,6 проц.

Змагаемся за датэрміновае выкананне плана 1934 г. да XVII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі.

ТРЫКУТНІК.

ТЭРМІН ПАГРУЗКІ СКАРОЧАН УДВОЯ

БАЕРУЙСК. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Водніякі бабруйскай прыстані аднадушна ўхвалілі пранаову «Звязды» аб арганізацыі спаборніцтва водніякоў з чыгуначнікамі на хутчэйшую дастаўку бульбы і гародніны пролетарскім цэнтрам. Пытанне абмеркавана ва ўсіх брыгадах. Паміж ударнікамі воднага і чыгуначнага транспарта заключаецца сацдагавор.

Лепшая брыгада прыстані **Хоняка**, уключыўшыся ў спаборніцтва з чыгуначнікамі, нагрузіла 27 верасня адзін вагон бульбы для Ленінграда за 1 гадзіну 10 мінут, скараціўшы ў два разы тэрмін нагрузкі.

ДОДЗІН.

РЭАГАВАННЕ ПА ГОРАЦКУ

Штодзённа, калі паштальён прыносіць карэспандэнцыю, горацкія раённыя арганізацыі атрымліваюць дзесяткі пісем, якія дасылаюцца з розных цэнтральных газет на расследванне і рэагаванне.

Асабліва многа пісем прыходзіць в газеты «Звязда» на імя райкома партыі. Кіраўнік спраў райкома **т. Козак,** раскрываючы канверты, дзівіцца:

— Ну і пішуць-жа. Пяць-восем пісем штодня. Чаму так многа?

Сакратар райкома т. **Вільчак** не дзівіцца. Для яго ўсё ясна:

— Нарабіла «Звязда» спраў артыкулам «Чаму Горкі на чорнай дошцы». Не акапаешся ад пісем.

Праў т. Вільчак.

Гэты важнейшы палітычны сігнал дала рэдакцыя на аснове пісьма калгасніка, якое было праверана на месцы спецыяльным карэспандэнтам «Звязды».

У гэтым пісьме і артыкуле выкрывалася практыка кулацкай хутарызацыі, якая прадаўжалася ў раёне і ў гэтым годзе. Там гаварылася аб засмечанасці калгасаў класава-варожымі элементамі, выкрываліся сапраўдныя прычыны адставання раёна.

Як-жа рэагавалі ў раёне на гэты артыкул. Раённая газета «**Ленінскі шлях**» яго перадрукавала і прабіла ад сябе прыпіску, сэнс якой можна разумець так: часткова прызнаем факты, часткова не. Прыпіска гэта была фармальнай неабходнасцю, а не рэагаваннем па сутнасці.

Райком партыі «рэагаваў» павольна, не спяшаючыся. Даволі сказаць, што артыкул «Звязды» быў надрукаван 16 чэрвеня, а пастанова РК КП(б)Б у раённай газеце змешчана 23 ліпеня.

У гэтай пастанове гаворыцца, што вінаватыя знімаюцца з работы, некаторыя з іх аддаюцца пад суд, а на справе... перакідваюцца на работу ў іншыя сельсоветы.

Так, адзін з «герояў» гаспадаўскіх спраў **Хамутоў** быў перакінут на пасаду старшыні калгаса ў Чарнеўскі сельсавет; былы старшыня сельсавета **Паўлаў** прызначаецца таксама старшынёй калгаса, а **Ксяндзоў** уведзен у годнасць «калгаснага актывіста». У выніку кулацкая практыка хутарызацыі ў раёне не спынілася.

Але гэта не выпадак, не выключэнне. Такая ўжо сістэма «рэагавання» ў Горацкім раёне.

Возьмем другі сігнал «Звязды» ад 27 жніўня. У рэдакцыю «Звязды» пісаў т. **Лабусаў,** што з бібліятэкі саўгаса «**Дрыбін**» выкінулі творы класікаў марксізма. Спецыяльны карэспандэнт праверыў пісьмо. Факты пацвердзіліся. Пісьмо было надрукавана.

Прайшло больш месяца, а райком партыі ўсё яшчэ не сабраўся разгледзець на сваім пасяджэнні гэты факт.

А што ўжо гаварыць аб пісьмах працоўных, якія, будучы неапублікаванымі, паступаюць на расследванне ў раённыя арганізацыі. Яны марнуюцца месяцамі. У гэтых адносінах асабліва вызначаецца, як не дзіўна, раённы пракурор т. **Сідараў.**

Па некаторых пісьмах фармальна прымаюцца пэўныя меры. Але толькі фармальна.

Напрыклад, рэагаванне на пісьмо калгаснікаў, перасланае «Правдой» у «Звязду» аб тым, што ў ліхачэўскім сельспажыўтаварыстве працаваў старшынёй праўлення Ліцвінкоў, які краў грамадскія грошы—растраціў звыш 5.000 руб., прысвойваў сабе дэфіцытныя тавары і т. д.

Вы думаеце, што злачынцу пакаралі. Памыляецеся. Праўда, Ліцвінкова засудзілі як быццам на пару гадоў, але ён і зараз працуе... прыёмшчыкам ільнатрасты на горацкім ільназаводзе.

У Маслакоўскай няпоўнай сярэдняй школе—пісалі ў тым-жа пісьме калгаснікі—арудуюць кулацкія элементы—**Дамарацкі, Ціткоў, Крапівін, Ульяноўская, Невяроўская. Факт пацвердзіўся.**

Што-ж зрабілі райком, РВК?

25 ліпеня аб гэтай-жа школе ў райком і райАНА паступіла заява ад групы сялян, якія патрабавалі прагнаць са школы Дамарацкага, Ціткова і Крапівіна. Прайшоў месяц. Пачаліся заняткі, а ў раёне так і не сабраліся разгледзець ні пісьма ў «Правду», ні заявы сялян. Праўда, Ціткова забралі, але як і куды. Райком ЛКСМБ паслаў яго... на вучобу ў Менск.

Не, не рэагуюць па-большэвіцку на пісьмы працоўных у Горацкім раёне. Не вядзецца работа з рабселькорамі, не выхоўваюцца маладыя, вытрыманыя кадры большэвіцкага друку.

Аб гэтым гаворыць і артыкул «Звязды», апублікаваны ў нумары за 16 верасня аб **«селькорах»** Піліпавым і Нов'кавым. Аб гэтым гаворыць і такі прыклад.

З мястэчка Горкі піша ў «**Ленінскі шлях**» служачая аптэкі **Кегеліс.** Яе пісьмы—мяшчанскія, абывацельскія склокі. Яна літаральна тэрарызуе мясцовых работнікаў, дый раённых часамі таксама. Аднак, яна «селькорка», не раскрыта, не паказан яе сапраўдны мяшчанскі, абывацельскі твар.

Гэта «селькорка», абяцяючыя былога настаўніка Беліка (па нацыянальнасці украінца), характарызавала яго так:

— Гэта хахлацкая морда зрывае ўсю работу...

Ці-ж не ясна, што гэта мяшчанка поўна шавіністычнай нянавісці да чалавека другой нацыянальнасці. Чаго можна чакаць ад такой «селькоркі».

Райком партыі недаацэньвае палітычнага значэння пісем працоўных. Палітычна-масавая работа сярод рабселькораў не вядзецца. На сігналы друку і пісьмы калгаснікаў, рабочых і служачых няма хуткага і вычарпальнага рэагавання.

А. МІКУЦКІ.



Панава адрамантаваны дом для рабочых у Гомелі.

«Тэхнічная рэканструкцыя прамысловасці, сельскай гаспадаркі і транспарта з'яўляецца рашаючай гаспадарчай задачай, якая стаіць перад советамі ў другой пяцігодцы. Выраўнанне гэтай задачы немыслима без рашучага павышэння якасных паказальнікаў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, без далейшага павышэння прадукцыйнасці працы, аўладання тэхнікай, асваення новых вытворчасцей, паляпшэння якасці прадукцыі і зніжэння сабекошту, і ўмацавання прапоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах, у саўгасах, у калгасах і ва ўсім совецкім апараце, а таксама далейшага паляпшэння матэрыяльнага і культурнага абслугоўвання працоўных.

Перад советамі гарадоў і рабочых пасёлкаў, сёл і вёсак стаяць велізарныя задачы па павышэнню матэрыяльна-культурнага ўзроўню працоўных мас. Далейшае разгортванне комунальнай гаспадаркі гарадоў, упарадкавання рабочых пасёлкаў і раённых цэнтраў, будаўніцтва школ, больніц і лазняў, дзіцячых садоў, ясляй і пляцовак, разгортванне жыллёвага і дарожнага будаўніцтва, клопаты аб грамадскім харчаванні, аб культурным совецкім гандлі, — усё гэта павінна з'яўляцца базавой праграмай работы советаў».

(З звароту ЦВК СССР).

ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ VII З'ЕЗДА СОВЕТАЎ

НАША ФАБРЫКА НЕ ВЕДАЕ ПРАРЫВАЎ

Наша фабрыка ўключаецца ў вытворчы паход імя VII з'езда советаў. Мы выканалі промфінплан першага паўгоддзя на 105,4 проц., у тым ліку па экспарту на 123,5 проц.

Вытворчую праграму III квартала выканалі раней тэрміну — 28 верасня.

Па якасных паказальніках мы маем наступнае: Прадукцыйнасць працы ўзнялася на 6 проц., знізілі сабекошт гатовай прадукцыі на 3,5 проц., а кожны процант зніжэння сабекошту азначае 5.800 руб. эканоміі. Па браку таксама маем зніжэнне: па каробках на 4 проц. супроць планавых — 6 проц., па саломцы на 6 проц. супроць 7 проц.

Перш за ўсё — выканаць гадавы промфінплан па ўсіх паказальніках да 1 снежня 1934 г. Адсюль выцякае неабходнасць практычных мерапрыемстваў, забяспечваючых выкананне гэтага самаабавязацельства. Сюды, вядома, перш за ўсё і галоўным чынам уваходзіць падрыхтоўка фабрыкі да зімы.

Сярод іншых мерапрыемстваў апал займае самае адказнае месца, бо ад гэтага залежыць бесперабойная работа фабрыкі. Зараз мы маем запас апалу (торфу і дроў) на 1 месяц і мы ўсімі сіламі змагаемся за стварэнне поўнага запасу апалу.

Да 15 кастрычніка патрэбны запас апалу будзе створан.

Другой задачай з'яўляецца заканчэнне новага цэха экспэртных запалак і бягучы рамонт фабрыкі. Новы цэх ужо гатоў, заканчваюцца апошнія дробныя работы. 5 кастрычніка цэх прыступае да работы.

Не забылі мы і **пра патрэбы саміх рабочых.** Будуем два новыя дамы для кватэр рабочых. Адрамантавалі за рахунак фабрыкі 22 кватэры лепшым ударнікам, дапамагаем у рамонце кватэр астатнім рабочым.

Мы павінны даць запалку самай высокай якасці. А якасць упіраецца ва ўзровень кваліфікацыі станкавога. Адсюль вынікае задача арганізацыі тэхнічнай вучобы. Мы абавязуемся ахапіць тэхнічнай вучобай 200 новых чалавек, падрыхтаваць з іх не менш 150 выдатнікаў.

Зараз на фабрыцы ёсць 250 выдатнікаў, тэхнічнай вучобай ахоплена 350 чалавек. І калі дадаць да тых, якіх мы ўзяліся ўцягнуць у тэхнічную вучобу, то атрымаем 90 проц. усіх рабочых фабрыкі.

Я. Ф. БАРДЗІЯНАЎ.
Сакратар парткома фабрыкі «Пролетарская перамога».

ПА-ДЗЕЛАВОМУ ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА III УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ.

ШТО МЫ ЗРАБІЛІ

Рэдактары цэхавых і брыгадных газет завода імя Варашылава звярнуліся да ўсіх рэдактароў нізавых газет аб правядзенні месячніка абмену вопытам работы нізавога друку. Яны ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Сёння адзін з рэдактароў цэхгазеты завода імя Варашылава тав. БРАЎДЭ дае справаздачу аб праробленай газетай рабоце.

Рэдкалегія штодзённкі «Гудок» (цэх шырспажыву завода імя Варашылава) была выбрана ў красавіку гэтага года. Спачатку газета не была масавай, яе выпускалі толькі члены рэдкалегіі. Мы паставілі перад сабой задачу — стварыць рабкоўраўскі актыў.

Для прыцягнення рабкораў мы спачатку давалі асобным рабочым заданні, стваралі брыгады па абследванню асобных пытанняў і зараз вакол газеты складзен добры рабкоўраўскі актыў у ліку 12 чалавек (усяго ў цэху 40 рабочых).

Сваёй работай газета дабілася таго, што цэх пачаў выконваць промфінплан. У красавіку промфінплан быў выкаван толькі на 76 проц. Газета высунула лозунг — «перавыканаць майскі план, з тым каб пакрыць красавіцкі прарыў».

Газета паказвала канкрэтных вінаватых зрыву плана, недахопы дэталей, дрэнную работу штампа і т. д. Было разгорнута соцспаборніцтва — індывідуальнае і паміж брыгадамі, створаны ўдарныя брыгады зборнічкаў. У рэзультаце мы дабіліся, што прарыў быў пакрыт і цэх выканаў паўгадавы план на 100,4 проц.

Газета выходзіць два разы ў пасяцідневку. Да гэтага часу не было віводнага прагулу.

Да газеты мы, як дапатак, выпускаем вітрыну карыкатур з надпісамі. Яна выходзіць адзін раз у дэкаду. Гэтымі карыкатурамі мы моцна б'ем па канкрэтных вінаватых у нашых недахопах.

Рыхтуючыся да ўсебеларускага з'езда рабкораў, мы ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па падрыхтоўцы да зімы, — аб поўным ахопе навучаннем рабочых цэха, рабоце з рабкорамі і т. д., і праз шматтыражку «Варашылавец» выклікалі на соцспаборніцтва іншыя цэхавыя газеты.

За добрую работу наша насценгазета прыкутнікам завода промінравала. Аднак, газета мае і недахопы. Недастаткова асвятляюцца станоўчыя моманты ў рабоце цэха, недастаткова выпукляюцца рэзультаты, якіх наша газета дабілася і недастаткова яшчэ работа з рабкорамі. Да ўсебеларускага з'езда рабкораў гэтыя недахопы будуць выпраўлены.

Наша задача — дабіцца права быць выбранымі на ўсебеларускі з'езд, і права выстаўкі сваіх газет у вітрыну лепшых газет на ўсебеларускім з'ездзе.

Рэдактар штодзённкі цэха шырспажыву завода імя Варашылава.

БРАЎДЭ.

А. ХАЦКЕВІЧ

НАРОДНЫ КАМІСАР ФІНАНСАЎ БССР

ВАЖНЕЙШЫ ЗАКОН

ЦВК і СНК СССР прынялі закон аб адзіначасовым падатку на аднаасобныя сялянскія гаспадаркі ў 1934 г.

Буйны рост усіх галін нашай соцыялістычнай гаспадаркі, высокі ўраджай бягучага года, хуткае разгортванне таваразвароту паміж гарадам і вёскай, рост неземляробчых заработкаў—усё гэта стварае надзвычай спрыяючыя ўмовы для росту прашовых даходаў сялянства.

Кан'юнктурныя ўмовы бягучага часу асабліва спрыяюць павелічэнню прашовых даходаў аднаасобнага сектара вёскі, у прыватнасці найбольш заможнай яго часткі. У той час, як калгасны сектар, выканаўшы план паставак прадуктаў сельскай гаспадаркі дзяржаве, ліцкі сваёй прадукцыі прадае кааперацыі і іншым дзяржаўным закупачным арганізацыям, селянін-аднаасобнік большую частку іх рэалізуе на рынку па больш высокіх цэнах. Больш таго, ён часта ўсімі спосабамі ўхіляецца і ад выканання заданняў па дзяржаўных паставках з тым, каб потым рэалізаваць прадукты сваёй гаспадаркі на рынку па больш высокіх, а іншы раз і проста па спекуляцыйных цэнах.

Побач з ростам матэрыяльнай забяспечанасці, перадавая, найбольш палітычна-свядомая частка сялянства, арганізаваная ў калгасах, прымае ўсё больш шырокі ўдзел у фінансаванні соцыялістычнага будаўніцтва шляхам розных добраахвотных плацяжоў, добраахвотна і шырока дапамагае матэрыяльна правядзенню цаасобных соцыяльна-культурных мерапрыемстваў. Вядома, напрыклад, шырокая дапамога калгасаў у справе будаўніцтва і ўтрымання школ, больніц, клубаў, у справе арганізацыі і ўтрымання сеткі ветэрынарных і агранамічных устаноў. Вядома таксама, што калгасны сектар непараўнальна больш ўдзел прымае ў такіх фінансавых мерапрыемствах, як рэалізацыя дзяржаўных пазык. Кожны калгасны двор падпісаўся на пазыку «Другая пяцігодка» ў сярэднім на 37 руб., а аднаасобны двор—толькі на 5,5 руб.

Такім чынам аднаасобны сектар ва ўсіх гэтых справах значна адстае ад калгаснага. Між тым, працоўны аднаасобнік у поўнай меры карыстаецца школамі, больніцамі, ветэрынарнымі ўстановамі, дарогамі, сродкамі сувязі і іншымі дасягненнямі нашай соцыялістычнай гаспадаркі і культуры, а фінансаванне якіх затрачваюцца вялікія сродкі.

Таму зусім правільна, што высокія кан'юнктурныя даходы, якія атрымлівае ў сучасны момант аднаасобнік, будуць абкладзены асобным адзінаразовым падаткам, зусім правільна, што частка гэтых высокіх даходаў аднаасобніка шляхам адзінаразовага падатку будзе вернута на задаваленне розных патрэб усяго соцыялістычнага грамадства нашай пролетарскай дзяржавы, на ўзмацненне бюджэтаў мясцовых советаў, на паляпшэнне задавалення патрэб мясцовага насельніцтва.

Як паказвае сама назва закона, да адзінаразовага падатку прыцягваюцца толькі аднаасобныя сялянскія гаспадаркі. Гаспадаркі рабочых і служачых, якія вядуць сельскую гаспадарку на прысядзібнай зямлі і ў якіх заработная плата з'яўляецца асноўнай крыніцай іх даходаў, а таксама гаспадаркі калгаснікаў зусім не плацяць падатку.

Таксама поўнасцю вызваляюцца ад падатку аднаасобныя гаспадаркі, вызваленыя ў 1934 г. ад сельска-гаспадарчага падатку па маламоцнасці іх гаспадарак, у склад якіх уваходзяць героі Совецкага Саюза, асобы, узнагароджаныя ордэнамі Саюза ССР, або рэволюцыйнай зброяй і героі працы; чырвонаармейскія гаспадаркі, інваліды вайны і працы, аднесеныя да I, II і III груп інваліднасці, гаспадаркі сем'яў сельскіх актывістаў, пацярпеўшых ад кулацкай помсты і гаспадаркі сем'яў работнікаў лесу, забітых у часе выканання імі службовых абавязкаў, аднаасобныя гаспадаркі, якія закантрактаваліся або самазамацаваліся на падземную работу ў вугольнай прамысловасці, гаспадаркі, перайшоўшыя ў 1934 г. на пастаянную работу ў соўгасы па дагаварах на час не менш с.-г. сезона, і гаспадаркі перасяленцаў, вызваленыя ў 1934 г. ад с.-г. падатку.

Стаўкі падатку розныя для гаспадарак рознай моцнасці: для гаспадарак, не маючых значных даходаў, стаўкі падатку невялікія (15-25 руб.), для больш моцных гаспадарак і стаўкі падатку большыя.

Сельскім советам законам прадастаўлена права вызваляць поўнасцю, або часткова ад адзінаразовага падатку маламоцныя аднаасобныя гаспадаркі з зацвярджэннем спісаў гэтых гаспадарак раённымі выканаўчымі камітэтамі.

Апрача таго, раённыя выканаўчыя камітэты могуць поўнасцю або часткова вызваляць ад падатку аднаасобныя гаспадаркі, якія акуратна (поўнасцю і ў тэрмін) выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай па грашовых плацяжах і абавязковых паставках с.-г. прадуктаў.

Адначасова з гэтым гаспадаркам аднаасобнікаў, якія злосна не выконваюць даных ім планаў посеву і абавязковых паставак с.-г. прадуктаў, налічаная ў звычайным парадку сума падатку падвойваецца. Кулацкія гаспадаркі ўплачваюць адзінаразовы падатак у размеры 200 проц. с.-г. падатку 1934 года.

Такім чынам закон аб адзінаразовым падатку дае шырокія ільготы маламоцным аднаасобным гаспадаркам і гаспадаркам, своечасова і добрасумленна выконваючым свае абавязацельствы перад дзяржавай.

Раённыя выканаўчыя камітэты і сельскія советы з усёй уважлівасцю павінны падыйсці да правядзення гэтага падатку. Да плацяжу адзінаразовага падатку ні ў якім разе не павінны быць прыцягнуты тыя гаспадаркі, якія, згодна закона, поўнасцю вызваляюцца ад падатку.

З асаблівай уважлівасцю сельскія советы і раённыя выканаўчыя камітэты павінны падыйсці да пытанняў поўнага, або часткова вызваленны ад падатку маламоцных аднаасобных гаспадарак.

Неабходна таксама шырока растлумачыць працоўным аднаасобнікам, што яны могуць атрымаць скідкі па падатку пры ўмове акуратнага выканання сваіх грашовых абавязацельстваў і абавязацельстваў па абавязковай паставе прадуктаў сельскай гаспадаркі дзяржаве, і што, наадварот, злоснае невыкананне гэтых абавязацельстваў цягне за сабою налічэнне падатку ў падвойным размеры.

Папулярызаваць гэтыя важнейшыя пункты закона сярод шырокіх мас аднаасобнікаў, правільна і ўмела ажыццявіць іх на справе—адна з адказных задач, якія стаяць перад райвыканкомамі, сельскімі советамі і фінансавымі органамі пры правядзенні адзінаразовага падатку.

Па ўсяму Саюзу ССР у сувязі з падрыхтоўкай да VII з'езда советаў узнімаецца магутная хваля творчага энтузіязму працоўных мас, разгортваецца шырокая праверка выканання сваіх абавязацельстваў перад пролетарскай дзяржавай. Без усякіх нядоімак закончыць бягучы год, ні аднаго рубля запазычанасці соцыялістычнаму будаўніцтву—такую задачу павінны паставіць перад сабой советы, фінансавыя органы і грамадскасць кожнага раёна, кожнага сельсавета.

Трэба максімум увагі аддаць ажыццяўленню новага закона аб адзінаразовым падатку з аднаасобнікаў, дабіцца поўнага паступлення ў вызначаныя законам тэрміны налічаных сум гэтага падатку, забяспечыўшы аднаразова поўнае выкананне плацяжных заданняў па ўсіх іншых плацяжах мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

ПІСЬМІЦЫ рабочых і калгаснікаў

НАМ. САКРАТАРА МЕНГАРКОМА КП(б)Б тав. ХАДАСЕВІЧУ.

„ВЫНАХОДСТВА" ДЫРЭКТАРА ФРЫДМАНА

(ПІСЬМО ДАПРЫЗЫЎНІКА)

Мяне прызвалі на месячны дапрызыўны збор. На гэты час за мной павінны захоўвацца месца працы, сярэдняя зарплата, паёк, сталоўка і інш.

Але зусім інакш зрабіў дырэктар шынарамонтнай майстэрні **Фрыдман.** У той-жа дзень, калі мяне выклікаў райваенкамат, Фрыдман даў загад аб звальненні мяне з работы, матывуючы гэта тым, што нібы я не падыходжу да ты. 21 жніўня я звярнуўся дырэкцыі, каб атрымаць пра талоны на абеды. Фрыдман «аўтарытэтна» заявіў: «Н грошай выдаваць не будзем, б зняты з работы».

З гэтай прычыны я апынуў надзвычай цяжкіх матэрыяльна-бытавых умовах.

РАЙХЛІН.

**

Факты, указаныя ў пісьме тав. Райхліна, праверкай на месцы **поўнасцю пацвердзіліся.** Згодна загада райваенкамата 20 жніўня Райхлін быў выкліканы на збор для падрыхтоўкі да прызыву ў Чырвоную армію.

Праз тры дні Фрыдман выклікае да сябе ў габінет прызыўніка Райхліна і заяўляе: **«Вось табе 50 руб. грошай, падпішы паперку, што ты нічога да мяне не маеш».**

Райхлін, не разабраўшыся ў чым справа, распісаўся на падаванай дырэктарам паперцы. Была напісана заява Райхліна дырэктару аб тым, што ён по рачыць суворць звальнення я работы.

Гэта супакоіла Фрыдмана. не супакоіла Райхліна, які з апынуўся без работы і без ус сроўкаў для іспавання.

Мы ўпэўнены, што Менгар КП(б)Б разгледзіць гэта пыт і ўкажа пэўнае месца зарвацц ся чыноўніку Фрыдману.

ВАЛЬФСОН.

САКРАТАРУ МАЗЫРСКАГА РК КП(б)Б тав. ШЫМКОВ

ДЛЯ ІХ ЗАКОН НЕ ІСНУЕ

(ПІСЬМО АДЗІНАСОБНІЦЫ)

Мне ўжо 58 год. Ніякай гаспадаркі я не маю, сельгаспадатку я не плачу, як бяднячка.

У лютым 1934 года да мяне прыйшоў член сельсавета тав. Мацыеўскі С. і прадстаўнік калінінскай канторы Заготкышэлы тав. Зайчык і забралі ў лік мясапаставак апошнюю маю карову.

Паскардзілася я ў мазырскі РВК, адтуль далі распараджэнне вярнуць карову. Пашла я на пункт, а там нават са мной гаварыць не захацелі, выгналі вон.

Тады я падала заяву ў БССР, адкуль было дана распа жэнне райпракурору тав. Бар вярнуць мне карову, як неза ным ўзятую.

Але і на гэты раз з мяне па яліся і карову не вярнулі. За чык-жа базы прама заявіў: «М ровы не аддамо, для нас паст кон»(!?).

Калі-ж скончацца здзекі на мной?

ШУЛЯК ДАР

САКРАТАРУ ЖЛОБІНСКАГА РК КП(б)Б т. ПЛЕШАНОВУ

БЯЗДУШНЫЯ АДНОСІНЫ ДА НАСТАЎНІКАЎ

(ПІСЬМО РАБОТНІКА САЮЗА ПРАЦАСВЕТЫ)

У Жлобінскім раёне ігнаруюцца пастановы партыі і ўрада аб снабжэнні і паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў настаўніцтва.

Настаўніку Пяцрову (Чатарынскі сельсавет) дагэтуль не выдалі пайка за тэрвень, а на ўтрымліваў не выдалі за чэрвень, ліпень, і жнівень месяцы. Настаўніку Прохараву, з гэтага-ж сельсавета, яшчэ не выдалі пайка за чэрвень. У Стара - Руднянскім сельсавеце настаўнікі не атрымалі пайка за два месяцы.

Загадчык гэшлёвым аддзелам райсаюза тав. Мельцэр заяўляе: «За выключэннем хлеба, цукру і крупы ніякіх промтавараў настаўнікам не належыць». На справе-ж райсаюз мае нарад на атрыманне промтавараў для настаўніцтва на суму 4.900 руб.

Не лепш снабжаюцца настаўнікі і ў горадзе. Старшыня гарпо тав. Захарэнка за жнівень і верасень не выдаў настаўнікам хлеба, цукру і круп.

Па гэламу раду сельсветаў (Дабрычынскім, Бухарынскім, Ратушскім і іншых) настаўнікі не маюць кватэр. Бюракратычныя і бяздушныя адносіны да настаўніцы Лейкавай прымушаюць старшыню сельсавета тав. Жвірко, высяляўшы яе з кватэры без усякіх пастаў.

Як правіла, выплата зарплаты настаўнікам адбываецца са спазненнем на 2-3 тыдні.

КРЫВІЦА.

ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ тав. КУЗЬМІНУ

ЗЛАДЗЕІ НА ВОЛІ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

У 1932 годзе старшыня ас ніцкага сельпо, Рагачоўскага ёна, Цімашэнка Нічыпар рас ціў 1.602 руб. каператы грошай. За гэта ён быў знят боты і аддан пад суд. Прам вўшы справу 12 месяцаў, чоўскі нарсуд асудзіў Цімаш на 10 год пазбаўлення волі з фіскацыяй маемасці ў кар асаўніцкага сельпо. А Цімаш і зараз працуе старшынёй ка са «Пражэктар», дзе ён так разбазарвае калгасную маемас Кладаўшчыком калгаса Цімаш ка паставіў свайго сваяка Пан леева, які разам з ім раскрад калгаснае дабро.

Цімашэнка астаўся не пака ным і па сёнешні дзень.

В. ХАЦКЕВІЧ.

НАЧАЛЬНІКУ КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКІРЭДЫТУ тав. ВАРШАЎСКАМУ

АШЧАДНАСА У КАЛІДОРЫ

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

У ліпені бягучага года пачаў рамонт памяшкання Менскай паштовай канторы. Аддзяленне ашчадкасы, якое знаходзілася ў гэтым памяшканні, выселілі ў цёмны калідор, дзе зусім нельга працаваць.

Працаваць у калідоры і абслугоўваць клієнтаў пры такіх умовах немагчыма.

Каб хутчэй скончыць рамонт ніхто патрэбных мер не прымае. Ужо больш двух тыдняў рамонт зусім спынен.

АКСЕЛЬРОД.

По слядах пісем

„ТРЫ МЕСЯЦЫ НЕ ВЫПЛАЧВАЮЦЬ ГРОШАЙ ПА БЮЛЕТНЮ"

Пад такім загалоўкам у «Звязде» 12 верасня было змешчана пісьмо рабочага саўгаса «Шыпіян» (Смалявіцкі раён) тав. Пальчэнкі аб тым, што яму на працягу 3-х месяцаў не выплачваюць грошай па больнічнаму бюлетню. У тымжа пісьме тав. Пальчэнка пісаў, што нявыплата па 2-3 месяцы падрад зарплаты рабочым у саўгасе стала сістэматычным з'явішчам.

Як паведамляе Смалявіцкі раён профсовет, грошы па бюлетню тав. Пальчэнку выплачаны поўнасцю. Справа аб нявыплаце зарплаты рабочым знаходзіцца ў следчых органах.

Старшыня рабачкома ад работы аслабанён.

ПЯЦЬ ГОД БУДУЕЦЦА ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ

Фото-карэспандэнцыя Я. ШЫЛЯНКОВА.

Ужо 5 год у мястэчку Лепельчыцах будуецца Дом культуры. Ён не закончан. Няма патрэбных будаўнічых матэрыялаў. Печы не будуюцца, бо няма цэглы. Заводы, якія ёсць у раёне, працуюць дрэнна. Так, напрыклад, «Большэвіцкі змагар» выканала промфінплан тэрміны на 43 проц., але рабочай сілай арцелі не забяспечаны.

АТРЫ- І РАБО- АД СВА- ГАРОДАУ

000 рабо- БССР засе- бягучым го- адывідуаль- агароды. а ў асноў- закончы- Сабран ба- ўраджай, ведчыць аб ай карысці ленках інды- льнага ага- цтва. Так, ы гарбарні ашэвік» тав. ніцкаў са- са свайго а 140 пу- ульбы, ра- механічнага цэха ар- — 125 пудоў бульбы і 20 пудоў гародніны, рабочы рні імя Сталіна тав. Саламо- атрымаў са свайго агарода 100 пудоў бульбы і т. д. одскія арганізацыі «Большэ- аказалі дапамогу 220 рабо- у пабудове склепаў. Выданы , цвікі. заўкомы наступаюць шматлі- заявы аб адводзе зямельных каў для агародаў і ў будучым

У другім аддзеле ні міліцыі г. Менска ў стале заявак і выявак адсутнічаюць адведныя ўмовы для запаўнення лісткоў. Няма с пецыяльнага пакоя, сталоў, атрамента, ручак і т. д. Наведвальнікам прыходзіцца брать з дому а сабай атрамант, ручкі і т. д. і прымяняцца для запаўнення картак, хто як можа.
НА ЗДЫМКУ: на ведвальнік запаўняе картку на скамейцы.

АБ ЗМЕНЕ АРТ. III. РАЗДЗЕЛА II ПАСТАНОВЫ „АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ЗЕМЛЯРОБСТВА БССР І МЯСЦОВЫХ ЗЯМЕЛЬНЫХ ОРГАНАЎ"

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

У першым абзацы арт. III раздзела II пастановы ЦВК і СНК БССР ад 9 чэрвеня 1934 г. «Аб рэарганізацыі Народнага Камісарыята Земляробства БССР і мясцовых зямельных органаў» (З. З. БССР 1934 г., № 25, паст. 119) начальніка раённага зямельнага аддзела іменаваць загадчыкам раённага зямельнага аддзела, а намеснікам начальніка раённага зямельнага аддзела — намеснікам загадчыка раённага зямельнага аддзела.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

19 верасня 1934 г.
г. Менск.

ЛОК-НОТ ФІЗІОЛАГА

* * *

АБ ФІЗІЯЛОГІІ ХАРЧАВАННЯ

ы харчаванні папукоў толькі ым хлебам, бульбай і рыбным чам, рост іх у першыя 30 дзён амаль нармальна, потым за- ізацца, дзён праз 50 спы- а; далей вага іх падае і, урэш- дзён праз 108-110 папукі памі- ь, калі да жыўнасці не дадаць або малака, мяса, яек і інш. і адносна тлумачэння гэтых таў разышліся.

выказаў упэўненасць у тым, ў хлебна-бульбяна-тлушчавой е не хапала яшчэ нейкіх нявы- ых дадатковых матэрый, кры- якіх в'яўляюцца хларафіль- часткі расліін. Гэтыя невядо- матэрыі я назваў вітамінам М цела, масы жывой пратаплаз усім процілеглымі маім погля- явіліся пярэчанні з боку лейп ага прафесара Шэйнехта, які ць, што хлебна-бульбяна-тлу- ая дыета неміну ча прыводзіць мерці таму, што бялкі хлеба ўнацэнны і іх мала (3-4 проц.), льбе бялку столькі-ж. У хлебе апас солей кальцыя, натрыя, а і іода. У хлебе няма вітамі- А, Д і С, невядома ці дастат- вітамінаў В.

е пярэчанні заключаюцца ў што калі ў зярняці мала нат- і хлора, то ў хлеб дадаецца Бульба лічыцца багатай соля- рыбным тлушчы многа вітамі- А і Д. У вітаміне С папукі не аюць патрэбы, апрача таго ві- а С многа ў бульбе. Вітаміна а існуючых сучасных даных, і як у хлебе, так і ў бульбе. ще, калі-б бялкоў хлеба і буль- было мала, то адкуль браўся-б ы рост, прыкладна 50 проц. на яту месяца.

кім чынам, фізіялогія харчаван- учыць нас, што трэба разумна цаць меню, дастаўляючы арга- у ўсе неабходныя бялкі, солі, міны, вугляводы і тлушчы.

Праф. Л. РОЗАНАЎ.

У ЦВК БССР

АБ РАБОЦЕ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

29 верасня прэзідыум ЦВК БССР заслухаў даклад аб становішчы работы па мабілізацыі сродкаў і падатковай практыцы Талачынскага райвыканкома.

Талачынскі раён, з прычыны неадвальняючай работы раённага выканаўчага камітэта, райфа і сельсоветаў, як гэта канстатаваў прэзідыум ЦВК, на працягу 3 з паловай год ніводнага разу не забяспечыў выкананне планаў мабілізацыі сродкаў.

Зусім дрэнна райвыканком кіраваў і кампаніямі сельска-гаспадарчага падатку і самаабкладання на 1934 год. У рэзультаце мелі месца грубыя скрыўленні і парушэнні падатковай палітыкі.

Прэзідыум ЦВК БССР прапанаваў РВК, у бліжэйшым часе мабілізаваўшы ўсе сілы, ліквідаваць адзначаныя недахопы і забяспечыць выкананне фінплана па ўсіх плацяжах.

Прэзідыум ЦВК БССР звярнуў асаблівую ўвагу талачынскага райвыканкома на неабходнасць праверкі па ўсіх сельсоветах правільнасці правядзення сельгаспадатку і самаабкладання,—поўнае выяўленне даходаў адноасобнікаў і выяўленне кулацкіх гаспадарак і поўнае спагнанне з іх усіх плацяжоў і ліквідацыя па раёну нядоімак.

Прэзідыум ЦВК папярэдзіў старшыню Талачынскага райвыканкома т. Федарынчыка і ўвесь склад прэзідыума, што калі не будуць прыняты рашучыя меры да выканання прынятай на гэтым пасяджэнні пастановы прэзідыума ЦВК аб рабоце талачынскага райвыканкома па фінансах, да іх будуць прыняты суровыя меры ўздзеяння.

* * *

На гэтым-жа пасяджэнні быў заслуханы даклад Наркомасветы аб выніках правядзення конкурса советаў па падрыхтоўцы школ БССР да новага навучальнага года.

АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАРТА БССР

Секцыя археалогіі Беларускай Акадэміі Навук склала археалагічную карту паўднёва-ўсходняй часткі БССР. На гэту карту занесены археалагічныя помнікі дакласавага грамадства — першабытныя стаянкі, гарадзішчы і курганы, знойдзеныя экспедыцыяй, а таксама выяўленыя з літаратуры. Асаблівую цікавасць прадстаўляе занясенне на карту каля 700 стаянак першабытнага чалавека бронзавага і неалітычнага перыяда. Да карты складзены характарыстыкі помнікаў па асобных раёнах.

Фізкультурніца ЮЛЯ БАРАНАВА (Віцебск) на прыжках у вышыню заняла першае месца на ўсебеларускім спаборніцтве дыпламаўнаў. Тав. Баранава дасягнула вышыні 133 см.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІРЫ МАЙСТРОЎ БССР, УКРАІНЫ І ЗАКАЎКАЗЬЯ

ТІФЛІС, 1 кастрычніка. (Па тэлеграфу ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

У сёмым туры (29 верасня) выйгралі Рагозін у Каспарана і Сарокін у Верасава. Унічыю закончылі: Макагонаў В. — Кірылаў і Макагонаў М.—Гоглідзе. Адкладзены партыі: з перавагай у першых: Кмох—Сіліч і Раўзер—Канстанцінопальскі і ў роўным становішчы Эбралідзе—Селезнёў.

У восьмым туры (30 верасня) выйгралі Канстанцінопальскі ў Верасава, Раузер у Каспарана і Сіліч у Рагозіна. У нічыю закончылі Эбралідзе—Макагонаў В. Адкладзены партыі: у роўным становішчы Кірылаў—Макагонаў М. з перавагай у Селезнёва з Сарокіным. Не ігралі з-за хваробы Кмоха Гоглідзе—Кмох.

На першым месцы Макагонаў В. і Канстанцінопальскі: па + 4,5 з 6-ці. Далей Гоглідзе: + 4,5 з 7, Кмох і Сіліч: па + 3,5 з 6, Раўзер і Сарокін: па + 3 з 6-ці.

Майстар СІЛІЧ.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

* Соўнарком БССР адзначыў, што Белкаапсаюз, не гледзячы на спецыяльнае рашэнне ЦК і СНК, да гэтага часу не забяспечыў пералому ў пасенакапленні. Заданне на трэці квартал па паявых узносах кааперацыі па гораду ў суме 400 тыс. р. і па вёсцы — 4.800 тыс. руб. выканана на 10 верасня адпаведна на 32,8 проц. і 15,3 проц.

СНК абавязаў праўленне Белкаапсаюза і ўсю сістэму спажывецкай кааперацыі неадкладна прыняць меры для разгортвання масавай работы па забеспячэнню поўнага выканання плана пасенакапленні ў III і IV квартале.

Старшыня Белкаапсаюза тав. Баскін папярэджан, што калі ён у далейшым не забяспечыць выканання плана пасенакапленні і не ўстановіць штодзённага кіраўніцтва гэтай работай, то да праўлення БКС будуць ужыты меры фінансавай санкцыі.

Усім РВК, гарадскім і сельскім советам і фінансавым органам прапанавана аказаць шырокую дапамогу і садзейнасць кааперацыі ў збіранні паявых узносаў.

ПРЭМІЯ «ВІЦЕБСКАМУ ПРОЛЕТАРЫЮ»

* У сувязі з 17-гадовым юбілеем газеты «Віцебскі пролетарый» і выхадам пяцітысячнага нумара СНК пастанавіў адпусціць у распараджэнне рэдакцыі газеты 15 тысяч руб. на масавую работу, 7 тыс. руб. на паляпшэнне бытавых умоў работнікаў, а таксама выдаць у чацвертым квартале 1934 года легкавую машыну.

МЕЛІЯРАЦЫЙНЫЯ РАБОТЫ У СОЎГАСАХ

У бягучым годзе ў соўгасах Луг трэста і Малакопромтрэста праводзяцца буйныя меліярацыйныя работы. Меліярацыйя ахоплены балотныя масівы 9 соўгасаў Беларусі. Працуюць 9 экскаватараў, з якіх 3 плывучых.

У соўгасе «Залог пяцігодкі», Пухавіцкага раёна, будуецца дамба для агароджання асушаных балот соўгаса ад вод ракі Піч. У насып дамбы ўкладзена 45.000 кб. метраў зямлі.

У соўгасах ужо асушана 2.100 гектараў балота, адрамантаваны 87 кілометраў асушальных каналаў, вынята 831 тыс. куб. метраў зямлі. На меліярацыйныя работы асігнавана каля 2 млн. рублёў.

Лекцыя арыфметыкі ў падгатаўчэльным класе 27 узорнай яўрэйскай школы ў Менску.
НА ЗДЫМКУ: учаніца Клара Збанэк паказвае лічбу «6».

КНІГА АБ ПЕРАКОНАЎЧЫХ ЛЮДЗЕЯХ

«Беломорско-Балтийский канал им. Сталина». — История строительства. Под редакцией М. Горького, Л. Авербаха и С. Фирина. ОГИЗ — «История фабрик и заводов», Москва, 1934 год, цена 8 р., переплет 1 р. 50 коп.

Пры чытанні гэтай хвалюючай кнігі глыбока перажываеш радасць перамогі творчага генія комуністычнай партыі.

У гэтай кнізе з надзвычайнай добрасумленнасцю калектыў 34 совецкіх пісьменнікаў на чале з А. М. Горкім прасочвае гісторыю Беламорбуда, пачынаючы ад першапачатковых, яшчэ пры царызме створаных у гандлярскіх мэтах праектаў воднага шляху паміж Белым і Балтыйскім марамі, да пастановы совецкага ўрада аб пазве Беламорканала імем тав. Сталіна, імем натхняльніка гэтай будоўлі.

У цэнтры сваёй задачы пісьменнікі паставілі паказ двух «гатункаў людзей: людзей большэвізма, арганізатараў-выхаваўцаў і людзей са злачыннага і сацыяльна-варожага свету, людзей лёс якіх пад уплывам большэвікоў-чэкістаў атрымаў новы напрамак, людзей, якія сталі аб'ектам «перакоўкі».

Аўтары «Беламорканала» трымаюцца строга ў рамках дакументаў, фактаў, «натуральных» людзей. Аднак, гэта не фатаграфіі і не сухі пратакол. Перад чытачом разгортваюцца яркія і маляўнічыя кавалкі жыцця, якія пісьменнікі адолелі асвятліць імена так, што чытач якбы адчувае колеры і пахі, гукі і мыслі, яму становяцца бліжэйшымі і знаёмымі быт і характар людзей, ён як-бы перажывае сам гісторыю будаўніцтва.

Напісалі кнігу сапраўдныя мастакі. Таму асобныя карціны патрасаючыя, асобныя партрэты людзей проста прослішча ў хрэстаматыю, рад разгалзлаў насычаны глыбокім пачуццём, якое адразу перадаецца чытачу.

Вось уводны раздзел—«Краіна і яе ворагі», напісаны М. Горкім. У ім праводзіцца паралель—турмы ў капіталістычных краінах, нялюдскія катаванні, факты, ад якіх валасы дыбам становяцца, і сістэма папраўча-працоўнага выхавання злачынцаў у СССР. Вось наступны раздзел «ДПУ, інжынеры, праект». Устаюць жывыя фігуры буйнейшых гераічных чэкістаў, даюцца кароткія, але трапныя характарыстыкі інжынераў з былых шкоднікаў, паказваецца быт і лад жыцця пад дахам дома на Лубянцы (ДПУ). Раздзел «Зняволеныя». Колькі яркіх характараў злачынна-шкодніцкага свету, які прадстаіць абламаць і перайначыць. Раздзел «Чэкісты»—адзін з найбольш распрацаваных. Тут паказана ўся шматграннасць дзейнасці чэкістаў на Беламорбудзе.

Кніга шматграння, як шматграння сама эпапея Беламорбуда. Яна —падручнік сацыялістычнай будоўлі, бо паказвае яе канкрэтныя праяўленні. Яна—справачнік па Беламорканалу, бо дае праўдзівыя факты і багаты матэрыял. Яна—характарыстыка чэкіста-выхавацеля і гісторыя «ачуняння» дзесяткаў тысяч сацыяльна-хворых людзей. Яна, нарэшце,—кіраўніцтва па арганізацыі людзей, жывая крыніца вопыту большэвіцкай арганізацыі будаўніцтва.

Кніга «Беламорканал» павінна быць даведзена да кожнага рабочага чытача, да кожнага калгасніка. Той, хто прачытае яе, яшчэ больш палюбіць сваю совецкую радзіму.

Х. ДУНЕЦ.

У ІНСТЫТУТАХ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

* * *

ІНСТЫТУТ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ

Наш інстытут ставіць сабе задачай вывучыць нацыянальна-культурнае будаўніцтва працоўных літоўцаў і латышоў у БССР і даследаваць гісторыю класавай барацьбы ў буржуазнай Літве і Латвіі.

Літоўская секцыя інстытута занята цяпер складаннем падручніка па гісторыі Літвы для сярэдняй школы. Да гэтага часу марксісцкага падручніка па гісторыі Літвы не было. Уся работа разлічана на 2-3 гады. У бягучым годзе будзе апрацавана тэма «Разлажэнне феадалізма і развіццё капіталістычных адносін у Літве». Работа праводзіцца брыгадай пад кіраўніцтвам акад. **Матулайціса.**

Другой брыгадай інстытута апрацоўваецца і будзе ў гэтым годзе закончана хрэстаматыя на літоўскай мове. У хрэстаматыі будуць даны расшыраныя аддзелы па выкрыццю класавай ролі каталіцкай царквы, каталіцкіх свят і царкоўных абрадаў.

Латышская секцыяй інстытута нацменшасцей складаецца беларуска-латышскі практычны слоўнік, у які ўвойдуць 20-25 тысяч слоў. Над слоўнікам працуюць тт. **Я. Долгі** і **О. Панке.** Для рэдагавання латышскай часткі слоўніка запрошан выдатнейшы латышскі пролетарскі пісьменнік **Лінард Лайцен,** рэдагаванне беларускай часткі ўзяў на сябе тав. **Андрэй Александровіч.**

У асноўным слоўнік будзе скончан да 1 студзеня 1935 года. Выйшла з друку работа т. Шкільтэра **«Латгальскае нацыянальнае пытанне».** Работа мае актуальнае значэнне для вырашэння пытанняў ленінскай нацыянальнай палітыкі ў Латвіі.

У бягучым годзе будзе закончана кніга Шкільтэра **«Латышскі селянін у Беларусі да і пасля Окцябрскай рэволюцыі».** У гэтай кнізе будзе скарыстан багаты матэрыял па калектывізацыі латышскіх паселішч, сабраны сёлетняй улетку 1934 года.

Дырэктар інстытута акад. МАТУЛАЙЦІС.

Вучоны сакратар К. ШКІЛЬТЭР.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

8 кастрычніка ў 10 гадзін у памяшканні БІМЗО (пакой № 3), адбудзецца чарговы «ДЗЕНЬ ЗАВОЧНІКА». Усе завочнікі павінны з'явіцца на заняткі без спазнення. Сакратарам парткомаў забяспечыць явку завочнікаў.

АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ І ПРАПАГАНДЫ ЛЕНІНІЗМА МЕНГАРКОМА КП(б)Б.

МЕНСК

ПРЫЕЗД АМЕРЫКАНСКАГА ПІСЬМЕННІКА МАРКА ХІНОЙ

У Менск прыехаў амерыканскі пісьменнік-эканаміст Марк Хіной. Пісьменнік робіць турысцкае падарожжа па СССР. Ён ужо наведаў Маскву, Ленінград, Харкаў, Днепрапятроўск, Данбас.

У Менску пісьменнік ужо наведаў дзяржаўную бібліятэку і выстаўку прамысловай кааперацыі.

⊙ ⊙ ⊙

ВЕЧАР ПРЫЗЫЎНІКОЎ адбыўся 30 верасня ў Доме партактыва.

ЭЛЕКТРАПАТЭФОН выпускае да з'езда промкааперацыі арцель «Точная механіка». Шавецкая арцель «Пролетарый» пашыравае свой асартымент модным фасонамі штаноў, дзіцячых польтаў, куртак і т. д. Арцель «Дрэваапрацоўшчык» асвоіла выпуск прыгожых турецкіх дываноў.

132 ВЯЧЭРНІЯ РАБОЧЫЯ ШКОЛЫ для рабочых пачалі працаваць з новага навучальнага года. У мінулым годзе працавала 101 школа.

ФІНАЛ РОЗЫГРЫШУ НА ПЯРШЫНСТВА БССР ПА ФУТБОЛУ адбыўся 30 верасня на стадыёне «Дынамо». Сустрэча закончылася з лікам 5:3 на карысць каманды БВА. Чырвоны пераходны спіг ВСФК БССР перадан гэтай камандзе, як заняўшай першынства ў рэспубліцы па футболу. Другое месца заняла каманда «Дынамо».

Дрэваапрацоўчы завод імя Молатава выпускае гатовымі дымі новы від мабілі — буфеты, разлічаныя на невялікую кватэру.
НА ЗДЫМКУ: шліфоўка буфета.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Паводле вестак бюро надвор'я, у Менску тэмпература паветра ноччу з 1 на 2 кастрычніка ад 7 да 9 градусаў, сёння днём ад 13 да 16 градусаў. Значная воблачнасць са змяншэннем днём, без асадкаў. Вятры слабыя да ўмераных паўднёва-заходніх напрамкаў. Бачнасць умераная да добрай.

⊙ ⊙ ⊙

У ГОМЕЛЬ І ВІЦЕБСК выязджаюць 4 депутаты горсовета для праверкі выканання самаабавязацельстваў па конкурсу-спаборніцтву горсоветаў на дапамогу чыгуначнаму транспарту і зазаванне жыллёвага фонда.

ПАЧАЛАСЯ РЭГУЛЯРНАЯ РАБОТА над складаннем Беларускай совецкай энцыклапедыі. З кастрычніка ў кабінеце прэзідэнта БелАН акадэміка Горбуна адбываецца першае пленарнае пасяджэнне рэдактароў аддзелаў і буйнейшых супрацоўнікаў з удзелам рэдактароў усіх нацыянальных слоўнікаў.

АГУЛЬНАГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЖОНАК РАБОЧЫХ і служачых склікаецца гарадскім советам 9-га кастрычніка. У яе рабоце прымуць удзел 700-800 дэлегатак. Па жаўтых і дамах жыллёва-зямельнага кіраўніцтва адбудуцца сходы жонак рабочых і служачых. Канферэнцыя абгаворыць пытанні аб падрыхтоўцы да зімы і азеляненні горада.

Менск, друкарня «Звязды»

Першы дзяржаўны тэатр (ДТ—1) СЁННЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА Пачатак у 8 гадзін веч.

Кіно-тэатр «ПРОЛЕТАРЫЙ» Ад 1-га кастрычніка Новы гукавы фільм вытворчасці Дзяржкінпрома Грузіі ПАТЭЛЛА Рэжысёр А. БЭК-НАЗАРАЎ. Галоўная роля: НАТА ВАЧНАДЗЕ Фільм: канцэрт муз-джаза пад кіраўніцтвам Штайнмана. Каса—з 1 гадзіны. Пачатак сеансаў—у 6, 7-30, 9 і 10-30

Кіно «Інтернацыянал» НОВАЯ ПРАГРАМА

Кіно «ПАРТАК» Замежны фільм НА СЁМЫМ НЕБЕ комедыя ў 7 частках.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" Ад 1-га кастрычніка Новы гукавы мастацкі фільм вытворчасці Межрабпомфільм ГАРЫЗОНТ Сцэнарый В. Шкловскага і Л. Кулешова. Рэжысёр Л. Кулешоў. У галоўных ролях: Лева Гарызонт—Н. Б'ітаў, Часаўшчых Д. Кара-Дмітрыеў, Фабрыкант—Хохло ў, Равін—А. Галодкіў і іншыя. ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ. ПАЧАТАК у 5-45, 7-30, 9-15 і 11 г. веч. Каса—ад 1 г. дня. У фойе перад кожным сеансам КАНЦЭРТЫ АРКЕСТРА. Новы рэпертуар

АДНАГАДОВЫЯ ПЕДКУРСЫ па падрыхтоўцы настаўнікаў для рускіх і беларускіх пачатковых школ, а таксама для малодшых класаў сярэдніх школ адкрываюцца ў г. Менску. На курсы прымаюцца без іспытаў асобы ва ўзросце не менш 16 з палов. г., якія маюць асвету ў аб'ёме самідодкі. Заявы прымаюцца да 8-га кастрычніка. К заявам прыкладаюцца: пасведчанне аб асвеце, метрыка, дакумент аб соцстано віцы і заваеная анкета. Усе прынятыя забяспечваюцца: харчаваннем і стыпендыяй ад 35 да 70 р. у месяц у залежнасці ад пяспяховасці. Інтэрната курсы не маюць. Прыезныя курсанты атрымліваюць па 20 р. у месяц кватэрных. Пачатак заняткаў 13-га кастрычніка 1934 г. Заявы накіроўваць па адрасу: Менск, Комунальная, 32 дырэктару курсаў. Загадчык ГАРАН'а Кузнецова.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр прадаўжае прыём заяў да 15 кастрычніка Ў ТЭАТРАЛЬНУЮ СТУДЫЮ. Тэрмін навучання—2 гады. Студыйцы забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і сталовай. Прымаюцца асобы з агульнай адукацыяй у аб'ёме 9-ці класаў. Паступаючыя трымаюць іспыты. Для паступлення неабходна пры заяве дадаць дакументы: аб соцпаходжанні, адукацыі, узросце, стане здароўя і аб месцы работы. Дакументы падаваць па адрасу: Менск, рог вуліц К. Маркса і Энгельса, БДТ-1. ДЫРЭКЦЫЯ.

Дырэкцыя і калектыў работнікаў Інстытута аграгэнетыкі і ўгнаення БелАН з вялікім жалем паведамляюць аб нечаканай канчыне у ноч на 1 кастрычніка студэнта Горацкага с.-г. інстытута ХАЦКЕВІЧА Б. М. і выказваюць сваё спачуванне яго родным. Вынас цела з клінічнага гарадка 2 кастрычніка 1934 г. у 4 г. дня.

Дырэкцыя, мясцком і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага мікрабіялагічнага інстытута выказваюць сваё спачуванне машыністу інстытута т. КІСЛЯКУ А. І. з прычыны смерці ЯГО ЖОНКІ.

Партком, адміністрацыя, мясцком і калектыў супрацоўнікоў НДІ пра мысловасці выказваюць глыбокае спачуванне т. ТЭЙФУ А. з поваду трагічнай смерці ЯГО СЫНА ДОДЗІ.

Прэзідыум і мясцком Беларускай Акадэміі Навук, дырэкцыя і калектыў супрацоўнікаў фізіка-матэматычнага інстытута БелАН выказваюць сваё спачуванне сям'і памершага навуковага супрацоўніка фізіка-матэматычнага інстытута БелАН С. Ф. ДОЎГАПОЛАВА.

Інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б
Завочная партвучоба па радыё
Да ўвагі ўсіх партыйных і комсамольскіх арганізацый, палітаддзелаў, членаў партыі і комсамола, беспартыйнага актыву горада і вёскі. Інстытут пры ЦК КП(б)Б а кастрычніка пачынае новы навучальны год. Праз Менскую радыёстанцыю ад пачаткаецца перадача лекцый партвучобы штодзённа з 19 г. 45 м. да 20 г. 45 м.
У гэтым годзе інстытут перадае наступныя лекцыі, разлічаныя на пятырокі партыйна-комсамольскі і беспартыйны актыў горада і вёскі, завочнікаў партвучобы, арганізаваных радыёслухачоў, прапагандыстаў партсеткі і выкладчыкаў:
ГІСТОРЫЯ ВКП(б).
Курс складаецца з 18 лекцый і будзе перадавацца на працягу кастрычніка—лютага месяца.
22-X — Рабочы рух 70-80 гг. і ўзнікненне марксізма ў Расіі (1-я лекцыя па курсу).
20-X — Вярацьба Леніна за рэволюцыйны марксізм, за партыю новага тыпу (2-я лекцыя па курсу).
ПАЛІТЭКАНОМІЯ.
Курс складаецца з 16 лекцый і будзе перадавацца ў кастрычніку — лютым.
27-X — Што такое палітычная эканомія і чаму яна вучыць? (1-я лекцыя па курсу).
ПЫТАННІ ГІСТОРЫІ І ПРАГРАМЫ КОМІНТЭРНА (10 лекцый).
Цыкл лекцый перадаецца на працягу 8-х месяцаў (лістапад 1934 г. — студзень 1935 г.) на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.
ПЫТАННІ ПРАГРАМЫ І СТАТУТА ВКП(б) (12 лекцый).
Цыкл лекцый перадаецца ў лютым—маі 1935 г. на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.
ЛЕНІНІЗМ (12 лекцый).
Курс лекцый перадаецца ў лютым—маі 1935 г.
ЯК ВЫВУЧАЦЬ ТВОРЫ КЛАСІКАЎ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА.
Кансультацыі па асобных творах будуць перадавацца 2 разы ў месяц на працягу ўсяго навучальнага года.
17-X — Як вывучаць творы В. І. Леніна.
28-X — Як вывучаць «Комуністычны маніфест».
ПЫТАННІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.
Цыкл перадаецца на працягу ўсяго навучальнага года па 3 лекцыі ў месяц у наступным парадку:
У кастрычніку — снежні — пытанні жывёлагадоўлі.
У снежні — лютым — пытанні арганізацыі с.-г. вытворчасці.
У сакавіку — маі — пытанні аграгэнікі.
9-X — ЦК ВКП(б) і ПК КП(б)Б аб паляпшэнні і развіцці жывёлагадоўлі.
21-X — Падрыхтавацца да зімовага стойлавага перыяда ў жывёлагадоўлі.
ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ ПА ПРАГРАМЕ КУРСАЎ АКТЫВА КАЛГАСАЎ, СОЎГАСАЎ І МТС
Лекцыі гэтага цыкла будуць перадавацца адпаведна праграмаўцы завочнікамі курсаў вучэбнага матэрыялу.
У кастрычніку лекцыя па першай тэме: 23-X — Два сеты—дзве сістэмы
ЭКАНАМІЧНАЯ ГЕАГРАФІЯ СССР (9 лекцый).
Цыкл перадаецца на працягу 8-х месяцаў — лістапад 1934 г. — студзень 1935 г.
ПЫТАННІ 2-й ПЯЦІГОДКІ (12 лекцый).
Цыкл перадаецца на працягу 4-х месяцаў — люты—май 1935 г.
ПЫТАННІ СУЧАСНАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (спецыяльны цыкл).
16-X — Літаратурная моладзь Совецкай краіны.
20-X — Калгасны рух у творах совецкіх пісьменнікаў.
26-X — Аб сучаснай сусветнай літаратуры.
ГУТАРКІ АБ ЗАВОЧНЫМ ПАРТНАВУЧАННІ Ў 1934-35 НАВУЧАЛЬН. Г.
7-X — Радыё на дапамогу самаадукацыі партактыва.
5-X — Як завочніку арганізаваць сваю вучобу.
11-X — Як павінна працаваць вучобная радыёпартаўдыторыя.
15-X — Як завочна вывучаць гісторыю ВКП(б) і палітэканомію.
ПЫТАННІ БЯГУЧАЙ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ І ЎРАДА
1, 8, 18, 19 і 25-га кастрычніка.
Тэмы лекцый будуць спачатку паведамляцца па радыё і ў газеце «Звязда».
Лекцыі завочнай партвучобы слухайце ў спецыяльна абсталяваных радыёаўдыторыях пры палітаддзелах МТС, соўгасаў і транспарта, у партабінетах райкомаў, у калгасах, на прадпрыемствах, а таксама ў сябе дома на індывідуальных радыёпрыёмніках і радыёкропках.
Запісвайцеся на арганізаванае слуханне радыёлекцый Інстытута.
З арганізаванымі радыёслухачамі праводзяцца выкладчыкамі Інстытута кансультацыі. Пасля здачы адпаведнага заліку слухачы атрымліваюць пасведчанне аб праслуханні адпаведнага курса лекцый.
Усе даведкі аб завочнай партвучобе можаце атрымаць у палітаддзелах, РК КП(б)Б — у інструктара па завочнай партвучобе і непасрэдна ў ІМЗО пры ЦК КП(б)Б.
Пытанні, водзывы і заўвагі аб радыёперадачах—па тэл. 23006, або дасылайце поштай без марак на адрас: Менск, вул. К. Маркса, 47/50. Інстытут пры ЦК КП(б)Б, Радыёсэктар.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Смалянскі тэхнікум насенаводства прадаўжае НАБОР і іспыты студэнтаў на 1 курс тэхнікума да 5-га кастрычніка 1934 г. Студэнты, зачыненыя ў тэхнікум, забяспечваюцца інтэрнатам, пральняй, лазняй, стыпендыяй па пяспяховасці і сталовай. Адрас: ст. Смалянцы, Аршанскага раёна, Смалянскі тэхнікум насенаводства.
Дырэкцыя.

Цэгельны промысел арцелі імя КАГА НОВІЧА, Гомельскага р-на (в. Пякалюбічы) ліквідуецца. Прэтэнзіі ад дзяржаўна-кааператыўных арганізацый і ад прыватных асоб прымаюцца да 10-X—1934 г. Пасля 10-X—34 г. ліквідном ніякіх прэтэнзій прымаць не будзе. Ліквідном.

Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж—Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпер—Е. КАГАН, ст. друкар—З. РУБІН.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Друкарні „Звязда" ПАТРЭБНЫ: ВУЧНІ-ЛІНАТЫПІСТЫ Зварачацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх для дырэктара.

Рэдакцыі газеты „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ МАШЫНІСТКІ, якія добра ведаюць беларускую мову. Зварачацца к сакратару рэдакцыі.

Уп. Гелоўлітбала № К—3242.